ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 19 (1345) | Субота, 7 сакавіка 1959 года | Цана 40 кап.

# Мы—будаўнікі камунізма

НІКОЛІ я не чакала, што мяне, радавую калгасніцу наша абласная партыйная канферэнцыя пашле дэлегатам на XXI з'езд КПСС. Светлыя і натхняючыя ўражанні ад работы з'езду заставуцца ў памяці на ўсё жыццё.

Я часта цяпер думаю над тым, чым я заслужыла такі вялікі давер партыі. Жыла і працавала так, як гэта патрабуецца ад грамадзяніна сацыялістычнай дзяржавы, герайчнага нічога не рабіла. Да калгаснай працы заўсёды ставілася сумленна і старанна. Штодзень сама перад сабой рабіла нібы справаздачу аб тым, што паспела за дзень выканаць і як у наступны дзень дамагчыся большага. Такі ж характар у кожнага савецкага чалавека. Напрыклад, я ў мінулым годзе ад кожнай з даручаных мне дзесяці кароў надаіла па 4384 кілаграмы малака. А за восем год працы на ферме здала калгасу каля 350 тысяч кілаграмаў малака.

Вось ужо звыш пяці год з'яўляюся членам ленінскай партыі. За гэты час выконвала дзесяткі розных партыйных даручэнняў. І гэта ж справа звычайная — камуніст абавязаны быць актыўным байцом партыі. Кожнае партыйнае даручэнне спрыяла росту маіх палітычных ведаў і пашырэнню светапогляду. І за гэта я сёння сваёй партыі кажу сардэчнае дзякуй.

Калі я і старшыня нашай арцелі, кандыдат у члены ЦК КПСС К. Арлоўскі збіраліся ехаць на з'езд, да нас прыйшлі хлебаробы, каб выказаць ад душы словы ўдзячнасці роднай партыі і нашаму ўраду.

— Вы, Надзея Якаўлеўна, раскажыце ў Маскве аб маёй сям'і, — гаварыў мне стары каваль тав. Цад. — Вы ж ведаеце, цяпер на розных участках ствараюцца брыгады камуністычнай працы. Вось і мы ўсёй сям'ёй вырашылі працаваць па-камуністычнаму.

Я наказ каваля выканала. Расказала дэлегатам з'езду, з якімі пазнёмілася ў Маскве, аб гэтай выключна працавітай сям'і, што яна сваё слова стрымае. Сёння ў хаце гэтага калгасніка ў поўным сэнсе слова камуністычнае жыццё, бо штогод сям'я атрымлівае за сваю працу па 150 — 200 тысяч рублёў.

— Раскажыце ў Маскве і пра наш санаторый, — настойваў з хваляваннем «шэф» калгаснага санаторыя, тэрапеўт мясцовай бальніцы Фёдар Храпко.

Зразумела, больш за ўсё было наказаў, каб я расказала аб нашай працы, аб тым, як за год адкармілі 1 700 свіней, як зараз у зімовыя дні штодзённа надойваем па 11 тысяч кілаграмаў малака, як за год дамагліся васьмі мільёнаў рублёў прыбытку ад жывёлагадоўлі, і аб многім іншым.

Але прыемна тое, што кожны ў сваім наказе падкрэсліваў:

— Толькі не трэба выхваляцца, сціпласць — вось галоўнае. Ты аб нашых дасягненнях расказвай і ў той жа час прыслухоўвайся, што ў іншых перадавых калгасах краіны робіцца. І самае галоўнае, добра запомні, якія задачы наша партыя ставіць перад калгасным сялянствам.

І я разумела, што ў гэтых словах—сама душа нашага рассветаўскага калгасніка.

У час з'езду мне і нашаму старшыні калгаса К. Арлоўскаму давялося сустрэцца з прадстаўнікамі многіх перадавых сельгасарцелей краіны. Як вядома, пераважная большасць дэлегатаў з'езду — радавыя байцы партыі, працаўнікі калгасаў, прадпрыемстваў і ўстаноў.

Працоўныя нашай краіны назвалі XXI з'езд КПСС з'ездам будаўнікоў камунізма. І нам, яго дэлегатам, тым больш адчувальна веліч і праўдзівасць такога народнага вызначэння. Калі пішу гэтыя радкі, я асабліва хвалююся. Ды як не хвалявацца! Мне, радавой калгасніцы, даручылі на з'ездзе ў вялікім Крамлёўскім палацы разам з кіраўнікамі партыі і ўрада абмяркоўваць важнейшыя задачы цудоўнай будучыні нашай краіны і шляхі іх вырашэння.

Быў час, а гэта было зусім нядаўна, калі мы сцвярджалі, што такім, як наш калгас «Рассвет», можа стаць кожны калгас краіны. Аб гэтым нават К. Арлоўскі напісаў некалькі год назад спецыяльную кнігу, якая хутка стала вельмі папулярнай. І вось за апошнія пяцігоддзе, дзякуючы мудрай палітыцы партыі ў галіне калгаснага будаўніцтва, з нашым «Рассветам» зраўняліся многія калгасы. Вельмі радасная з'ява! Калі я слухала даклад і заключнае слова Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, выступленні дэлегатаў з'езду, кіраўнікоў і прадстаўнікоў камуністычных партый замежных краін, дык адчувалася нейкая асаблівая цеплыня, народжаная сапраўдным подыхам блізкіх дзён камунізма. Я ўпэўнена, што гэткія пачуцці былі ва ўсіх дэлегатаў з'езду.

Вялізны размах стваральных работ новай сямігодкі яскрава адчуваецца ў кожнай названай на з'ездзе лічбе. Дастаткова сказаць, што капіталаўкладанні ў развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры за сямігодку будуць амаль роўныя тым укладанням, якія былі раней выдаткаваны за ўсе сорак адзін год Савецкай улады.

На з'ездзе нашай роднай партыі самай выдатнай падзеяй для мяне было тое, што я слухала разам з іншымі дэлегатамі даклад і заключную прамову Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, якія ўвасабляюць сапраўдную мудрасць ленінскай партыі. І вельмі радасна было слухаць прасякнутыя вялікім пафасам далейшага паспяховага калгаснага будаўніцтва прамовы дэлегатаў з'езду, прадстаўнікоў калгасаў т. т. Андрэевай, Бойкі, Мальцава і інш. У час перапынкаў работы з'езду нам удалося гутарыць з многімі пасланцамі камуністычных партый Кітая, Іспаніі, Румыніі, В'етнама і іншых краін. Усе гэтыя сустрэчы яшчэ і яшчэ раз гаварылі, наколькі бязмежныя любоў і давер братніх замежных партый да нашай краіны, якая смела будуе камуністычнае грамадства.

Прыехала я са з'езду з адзінай упэўненасцю: поспех сямігодкі вырашаецца самаадданай працай кожнага з нас. Усе мы—будаўнікі камунізма. Значыць, трэба ўзняць калгаснікаў на яшчэ больш актыўную працу.

Сёлетні год—першы год сямігодкі. Сёння мы ўжо робім новыя крокі да нашай яшчэ больш светлай будучыні.

На з'ездзе партыі Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў гаварыў, што і ў далейшым трэба ўсямерна ўмацоўваць нашы калгасы на аснове ўздыму грамадскай вытворчасці і росту непадзельных фондаў калгасаў. Асабліва падкрэслівалася, каб настойліва і планамерна весці справу на зближэнне калгаснай уласнасці з агульнанароднай. Гэта новы этап у развіцці калгаснага ладу.

Я думала аб сэнсе гэтых слоў, калі ішла пасля прыезду з Масквы на сустрэчу з калгаснікамі ў наш Дом культуры. І першыя мае словы да калгаснікаў у час сустрэчы былі аб тым, што ў рашэннях з'езду партыі выразна відаць абрысы камунізма. Даярка наша, мая сяброўка Ніна Бяляўская, спытала:

— Скажы, Якаўлеўна, ты пабывала ў магазінах Масквы, Мінска і іншых гарадоў. Як цяпер там, ёсць у дастатку малочныя і мясныя прадукты?

Калі я расказала, што ва ўсіх магазінах цяпер поўна на паліцах і мяса, і каўбас, і смятаны, і сыроў, і масла, і яек, і яблык,—гэта нашых калгаснікаў вельмі ўзрадавала. Тая ж Ніна Бяляўская тут жа ўсклікнула:

— А як жа інакш, будаўнік камунізма павінен мець усё...

На нашым сходзе, прысвечаным абмеркаванню матэрыялаў XXI з'езду КПСС, многія гаварылі, што характар чалавека камуністычнага грамадства загартоўваецца ў працы.

Спрадвеку лічылі, што для вясковай жанчыны свая карова — самая вялікая радасць. Калі я была яшчэ малой дзяўчынкай, у нашай беднай сям'і, якая працавала на кулака, усе марылі аб уласнай карове. І маці мне гаварыла: «Вырасцеш, заробіш грошай, карову купіш — будзеш шчаслівай».

Заможнае калгаснае жыццё стварыла мне магчымасць купіць і ўтрымліваць вельмі добрую карову. Гэта, вядома, была звычайная радасць. Але вось нядаўна я з вялікай радасцю адвяла сваю карову ў калгасны статак. Чаму? Ды таму, што ў калгасе ад кожнай каровы атрымліваюць у два разы больш малака, чым ад уласнай, ды таму, што наш калгасны статак налічвае цяпер 2 640 галоў буйнай рагатай жывёлы і кожны з нас лічыць і разумее, што ўвесь гэты статак — яго ўласнасць. Тым больш, што ў нас клопаты аб грамадскай гаспадарцы з'яўляюцца галоўным клопатам кожнага калгасніка, бо ён ведае, што менавіта грамадская гаспадарка — асноўная крыніца яго дабрабыту. І я першая на партыйным сходзе выказала думку аб тым, што настаў час назаўсёды аддаць сваю карову ў калгасны статак. І семсот васемнаццаць нашых калгаснікаў прывялі сваіх кароў у грамадскі статак.

Вядома, у гэтым патрыятычным пачыне нашых калгаснікаў таксама адчуваюцца парасткі камуністычнага заўтра, паяўленне рысаў камуністычнага характару ў нашых працаўнікоў.

У пачатку бягучага года наш калгас перайшоў поўнасцю на грашовую аплату працадня. Прыемна было паслухаць, з якой высокай свядомасцю падыходзілі калгаснікі да вырашэння гэтай задачы, калі яны распрацоўвалі тарыфную сетку расцэнак аплаты за працу. Згодна гэтай сеткі, на лёгкіх работах калгаснік атрымлівае 16—32 рублі ў дзень, а на больш цяжкіх — 38—54 рублі. Апрача таго, члены сельгасарцелі могуць па дзяржаўнай цане купіць у калгасе ўсе патрэбныя прадукты ў неабмежаванай колькасці.

Вось, напрыклад, літр малака прадаецца нам па 1 руб. 30 кап. Калі аб гэтым я расказала ў час паездкі ў Маскву сваім пасажырам па купэ, адзін грамадзянін запытаў:

— На рынку ж малако каштуе ў два і больш разоў даражэй, чым у вас. Ці не могуць такім чынам асобныя вашы калгаснікі купіць малака значна больш, чым трэба, і перапрадаць яго на рынку?

— Не, не могуць! — запэўніла я.

— Чаму? — здзівіўся ён.

Адказ на гэтае пытанне трэба шукаць у характары рассветаўскага калгасніка. Нашы поспехі маюць адзіную крыніцу — выключную сумленнасць і высокую свядомасць. І таму мы ўсе лічым грамадскую гаспадарку народнай гаспадаркай.

Гаворачы аб сённяшнім дні калгаса, бадай, нельга абыйсці тое, што цяпер у нашым калгасе ўзводзіцца шэсць грамадскіх сталовых, столькі ж памяшканняў для дзіцячых ясляў і дзве лазні-пральні. А гэта адзін з крокаў па шляху набліжэння нашага калгаса да культуры сацыялістычнага горада.

Хачу яшчэ расказаць, што ў 1958 г. непадзельны фонд калгаса складаў 19 мільёнаў рублёў, а ў канцы сямігодкі ён будзе складаць 40 мільёнаў! Па нашаму плану генеральнага будаўніцтва ў арцелі штогод будзе выдаткоўвацца на ўзвядзенне новых будынкаў па 3,5 мільёна рублёў. Калі летась мы прадалі дзяржаве 4,5 мільёна кілаграмаў малака, дык сёлета прададзім больш шасці мільёнаў. Калі летась вытворчасць мяса склала 90 цэнтнераў, дык сёлета яна дасягне 112 цэнтнераў, а ў наступныя гады сямігодкі — па 160—180 цэнтнераў на кожныя 100 гектараў сельгасугоддзяў.

Гэтыя лічбы нельга абыйсці. Яны яскрава сведчаць аб тых парастках камунізма, якія мы бачым сёння, аб той працы нашых людзей, якую яны вядуць за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXI з'езду КПСС.

У гэтых лічбах бачыш шырокія і светлыя гарызонты, адкрытыя перад намі нашай партыяй. Хочацца жыць і працаваць у імя светлай будучыні — камунізма.

**Надзея БЯЛЯЎСКАЯ,**
**даярка калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна.**

# Працаваць больш і лепш

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ КАЛЕКТЫВУ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ МІНСКАГА МУЗЫЧНАГА ВУЧЫЛІШЧА ІМЯ М. І. ГЛІНКІ

Наша магутная сацыялістычная Радзіма ўступіла ў новую стадыю развіцця — у перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства. Гістарычны XXI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза азнаменаваў пачатак першай сямігодкі, выдатныя перспектывы якой напаўняюць радасцю і гордасцю сэрцы савецкіх людзей, натхняюць іх на новыя працоўныя подзвігі дзеля славы любімай Айчыны. У дні небывалай палітычнай і працоўнай актыўнасці ўсяго савецкага народа, мы, як і кожны савецкі чалавек, перапоўнены жаданнем унесці свой уклад у агульнанародную справу магутнага ўздыму эканомікі, культуры, навукі нашай цудоўнай Радзімы.

У сваіх рашэннях XXI з'езд заклікаў усіх работнікаў культуры і мастацтва быць і надалей актыўнымі памочнікамі партыі і дзяржавы ў справе камуністычнага выхавання працоўных, у прапагандзе прынцыпаў камуністычнай маралі, у развіцці многанацыянальнай сацыялістычнай культуры, у фармаванні добрага эстэтычнага густу.

Прамы абавязак усіх нас, педагогаў, студэнтаў музычных, мастацкіх навучальных устаноў рэспублікі, прыкласці ўсе сілы на тое, каб як мага лепш задавальняць культурныя запатрабаванні працоўных.

Мы, выкладчыкі і студэнты Мінскага музычнага вучылішча імя М. І. Глінкі, старэйшай музычнай навучальнай установы рэспублікі, бяром на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Умацоўваючы сувязь вучылішча з жыццём, палепшыць падрыхтоўку кваліфікаваных спецыялістаў сярэдняга музычнага профілю.

2. Адкрыць пры вучылішчы двухгадовы універсітэт музычнай культуры для рабочай моладзі — членаў брыгад камуністычнай працы прамысловых прадпрыемстваў Ленінскага раёна Мінска.

3. Арганізаваць на станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава вячэрнюю школу агульнай музычнай адукацыі без аплаты за навучанне.

4. Для аказання дапамогі кіраўнікам самадзейных харавых калектываў, духавых і народных аркестраў беларускай сталіцы адкрыць пры вучылішчы пастаянны семінар. Сіламі выкладчыкаў і навучэнцаў старшых курсаў забяспечыць кіраўніцтва шасцю хорамі і чатырма аркестрамі народных інструментаў на прадпрыемствах, установах і навучальных установах горада.

5. На заводах, у калгасах даць у бягучым годзе не менш 50 канцэртаў і лекцый-канцэртаў па прапагандзе ў шырокіх масах твораў савецкай музыкі, рускай, беларускай і зарубежнай класікі.

6. Перайсці ў 1959 г. на поўнае самаабслугоўванне вучэбных памяшканняў і інтэрната вучылішча.

Заклікаем усе калектывы музычных, мастацкіх, культурна-асветных, навучальных устаноў, музычных і мастацкіх школ рэспублікі ўнесці свой дастойны ўклад у паспяховае выкананне грандыёзнай праграмы камуністычнага будаўніцтва, дапамагчы нашаму народу ў яго барацьбе за набліжэнне шчаслівай будучыні — камунізма.

**А. КАЛАНДЗЕНАК,**
дырэктар Мінскага музычнага вучылішча імя М. І. Глінкі.
**Р. ЛЕБЕДЗЕВА,**
сакратар партыйнай арганізацыі.
**Р. ПРАБШТЭЙН,**
старшыня мясцкома.
**Н. КАНДРАЦЕНКА,**
сакратар камсамольскай арганізацыі.

# НАША СВЯТА

Алена ВАСІЛЕВІЧ.

□

...Скажыце, вам не даводзілася ўзнімацца на рыштаванні якога-небудзь з мінскіх гмахаў у час яго будаўніцтва, скажам, на пяты ці шосты паверх? Можа, траплялі якраз на перапынак і разам з будаўнікамі сядзелі на пахучых смольных дошках? А калі так, то ці не было ў вас такога адчування, нібы вы ўзняліся над усім горадам і атрымалі права з вясёлай усмешкай сачыць за маленькімі пешаходамі, што з павагай глядзяць на вас знізу ўверх і ўсур'ёз пабойваюцца: хаця б вы, крый божа, не зляцелі адтуль?..

Не хвалюйцеся, таварышы! Рыштаванні моцныя і надзейныя, як моцныя і надзейныя рукі і нервы тых, хто праз гадзіну зноў возьмецца за кельму, за цэментавы раствор, за пявучую, звонкую цэглу.

Хто ж яны, уладальнікі гэтых спрытных рук, якім можна шчыра пазайздросціць?

Усё гэта — маладыя хлопцы і дзяўчаты, тое пасляваеннае пакаленне, якое ўзняло з руін нашы гарады і сёлы, набудавала заводаў і фабрык, стварыла каналы і нават моры, абудзіла ад спрадвечнага сну нямую дрымотную цаліну.

Аднак паколькі заўтра свята наша, жаночае, то і гаворка будзе пра нас, жанчын.

Прыгадваючы дакастрычніцкі лёс жанчыны-беларускі, нельга не ўспомніць поўную безнадзейнага суму «Песню жней»:

Пагнуўшы ў крук худыя спіны,
Сярпом махаючы крывым,
Мы, жонкі, ўдовы і дзяўчыны,
Пры доўгай постаці стаім.

. . . . . .

Гэй, жнема, бабкі і дзяўчынкі,
Гаруйма: гора — не напасць;
Пан справіць гучныя дажынкі:
За пот, кроў, слёзы—водкі дасць!
Мы будзем піць,
Як гора п'ём..

Песня гэта вылілася з глыбіні сэрца нашага народнага паэта Янкі Купалы, і ў ёй выразна адбілася доля беларускай жанчыны-сялянкі. Аднак не адна беларуска — дзесяткі мільёнаў жанчын ішлі гэтай беспрасветнай дарогай царскай Расіі.

... Толькі пасля Вялікага Кастрычніка выпрастала, сагнутую вякамі бяспраўя і здзеку спіну наша жанчына. Вечарамі, ледзь паспеўшы накарміць і пакласці дзяцей і не заўсёды паспяваючы сама пад'есці, бегла яна на лікбез, у вячэрнюю школу ў пошуках святла, якога не бачылі яе вочы да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Заходзіла яна ў фабрычныя і заводскія вароты і там настойліва прад'яўляла свае правы на месца ў новым жыцці, у бурлівым фабрычна-заводскім калектыве. Спачатку нясмела, а потым усё смялей і больш упэўнена, паўнапраўнай ужо гаспадыняй, пратоптвала яна новую, невядомую ёй дагэтуль сцежку калгаснага жыцця. Пераадольваючы няўпэўненасць і сарамлівасць, узнімалася на сцэну і на здзіўленне і радасць усім, хто яе слухаў, чаравала дзівосным голасам і песняй...

Якіх толькі дарог не прайшла, якіх ступеняў не пераадолела наша савецкая жанчына. І зараз мае яна ўсе правы ганарыцца той вышынёй, якой дасягнула за сорак год Савецкай улады.

Жанчына — міністр, прафесар, артыстка, доктар навук, аграном, інжынер, настаўніца, Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы, наравіце, дэпутат — наш гонар, наша павага.

Справа не толькі ў ганаровых званнях і пасадах. Справа ў тым, што хто б яны ні былі, яны перш за ўсё простыя, сціплыя людзі. Звернемся да канкрэтных імёнаў.

Хто цяпер не ведае брыгадзіра комплекснай брыгады будаўнікоў Марыю Макарэвіч, цудоўную дзяўчыну, Героя Сацыялістычнай Працы? Імя яе стала вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за межамі рэспублікі. Павучыцца майстэрству прыязджаюць да яе будаўнікі не толькі свае, беларускія. Кітайцы на што ўжо здатныя ў ўсяго маюць рукі, але і тыя, калі прыязджалі на экскурсію ў Мінск, задаволена ўсміхаліся і толькі пацмоквалі ў знак захаплення ўмелай работай марыінай брыгады. Выдатная работа простых савецкіх людзей!

Год назад мне давялося пазнаёміцца з Наташай Ждан і пісаць пра яе ў часопісе. Яе працоўная біяграфія — самая распаўсюджаная сярод будаўнікоў. Прыйшла з вёскі амаль падлеткам, пачынала, безумоўна, з падсобніц, а зараз — ого! Паспрабуй, уганіся за ёю! Праўда, з Наташай вельмі цяжка гутарыць на гэтую тэму — негаваркая дзяўчына, недалюблівае карэспандэнтаў: перашкаджаюць, маўляў, працаваць...

Завёўшы гутарку пра будаўніц, мне хочацца сказаць і пра людзей іншых спецыяльнасцей...

Асаблівай цеплынёй перапаўняецца сэрца, калі я ўспамінаю Марыю Андрэеўну Жыдовіч — выкладчыцу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктара філалагічных навук. Гэта разам з ёю ў 1944 г. наш абшарпаны і (чаго баяцца праўды!) галодны філалагічны факультэт хадзіў на суботнікі і нядзельнікі грузіць вугаль, па цаглінцы разбіраць руіны, капаць ямы і саджаць дрэвы вакол фізмата — адзінага ўцалелага ад вайны будынка Універсітэцкага гарадка...

Даўно прайшлі і забыліся тыя цяжкія дні, не забылася толькі цеплыня і сардэчнасць Марыі Андрэеўны, якою дзялілася яна тады з намі, студэнтамі, і якая так дапамагала нам у цяжкія хвіліны. Хоць пра гэта ніхто ніколі і не гаварыў... Сёння вось успомнілася ўсё.

Гаворачы пра жанчын, нельга абмінуць і нашых калгасніц, чые нястомныя рукі кормяць хлебам і салам усю рэспубліку. Чые, як не іхнія зыркія вочы не ўпусцяць ніводнай зёлкі ў полі, хто як не яны па расе і ў спёку полюць і даглядаюць лянок — наша беларускае багацце, нашу славу, хто як не яны песцяць на нашых палях маладуху-кукурузу.

Дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР абрана камсамолка-калгасніца Любоў Патрубейка. Вось дэпутацкая біяграфія са слоў самой Любы: «Нарадзілася ў 1937 г. ў вёсцы Туры (Пінскі раён). Бацькі простыя сяляне. Пры Савецкай уладзе сталі калгаснікамі... З васьмі год пайшла ў школу, а як скончыла яе — засталася ў сваім калгасе. Працавала, як і ўсе: у полі, на таку — усюды, куды пасылалі. Старалася, як магла. А цяпер вырошчваю кукурузу...»

І выдатна вырошчвае, хоць сама Люба пра гэта ні слова не гаворыць. Вось якія яны пайшлі дэпутаты — у 22 гады!

Старэйшыя ільнаводкі Праскоўя Калола і Ганна Гарэцкая, вядомыя кукурузаводкі звенявыя Марыя Алейнік і Вольга Амяльчук — усё гэта таксама самаадданыя радавыя нашых калгасных палёў. І тут жа поруч з імі хочацца ўспомніць імёны і жанчын-камандзіраў: у недалёкім мінулым — інжынера-дарожніка, а зараз дырэктара саўгаса «Новае Парэчча» Луізу Уцеўскую, старшынь калгасаў Таццяну Жыгалку, Паліну Кавалёву, Ганну Кумец. Узбуйнены калгас — гэта не малы карабель. І фарватэр, па якому ён ідзе, кожны год можа змяняцца: адно лета дажджлівае, другое, наадварот, засушлівае выдасца. А ты ўсё прадбач, усё ўзваж, усё перадумай...

Мы жывём у велічны гістарычны час. Новая сямігодка, у якую мы ўступілі ўсёй савецкай краінай, натхніла нашых людзей на новыя подзвігі, выклікала ў іх непахіснае імкненне тварыць, дзярэаць у імя Радзімы. Знамянальна, што XXI з'езд КПСС названы нашым шматмільённым народам з'ездам будаўнікоў камунізма.

На гэтым з'ездзе былі і жанчыны дэлегаткі з Беларусі. Іх пачуцці цудоўна выказала дэлегат з'езду — звеннявая калгаса «Кастрычнік» Камянецкага раёна Ганна Белявец:

«Мне, простай сялянцы, якая на сваіх плячах спазнала прыгнёт памешчыка, давялося разам з нашымі кіраўнікамі партыі і дзяржавы абмяркоўваць разгорнуты план будаўніцтва камунізма ў нашай краіне. Дык хіба ж гэта не гонар?».

Разам з Ганнай Белявец ганарымся ўсе мы, савецкія жанчыны, тым, што нам даверылі наша партыя і наш урад самім вырашаць складаныя дзяржаўныя задачы. І мы ўдзячны ім за тое, што ёсць перад намі велічная мэта.

Заўтра 8-е сакавіка — наша свята, дарагія сяброўкі!

Дома ўжо недзе шэпчуцца і мудруюць над падарункамі нашы дзеці і мужчыны... Ну што ж, няхай паклапоцяцца. Хіба мы не варты іх клопатаў і ўвагі?!.

# Першы з'езд журналістаў БССР

5 сакавіка ў Мінску адкрыўся Першы з'езд Саюза журналістаў БССР.

У прэзідыум з'езду выбіраюцца сакратар ЦК КПБ Ц. С. Гарбуноў, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ М. А. Халіпаў, загадчык сектара ЦК КПСС С. В. Шацкоў, старшыня аргбюро Саюза журналістаў БССР М. Я. Філімонаў, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР П. У. Броўка, сакратар ЦК ЛКСМБ Н. Г. Краснова, член аргбюро Саюза журналістаў СССР І. Ф. Шыпілаў, рэдактар газеты «Звязда» В. А. Пыжкоў, рэдактар газеты «Калгасная праўда» В. Л. Фясько, намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ Р. В. Канавалаў, старшыня Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню пры Савеце Міністраў БССР С. М. Сцёпін, дырэктар БЕЛТА Ф. Я. Кляцкоў, прадстаўнікі Саюзаў журналістаў Украіны Я. А. Лазебнік, Літвы — С. Е. Бістрыцкас, Эстоніі—С. М. Міккін, рэдактар часопіса «Работніца і сялянка» А. П. Ус, рэдактар віцебскай абласной газеты «Віцебскі рабочы» П. П. Бяляўскі, сакратар лельчыцкай райгазеты «Савецкае Палессе» Т. І. Рашчэня і іншыя.

З вялікім уздымам пад бурныя апладысменты ў ганаровы прэзідыум з'езду выбіраецца Прэзідыум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пасля выбрання мандатнай і рэдакцыйнай камісій аднагалосна зацвярджаецца наступны парадак дня з'езду.

1. Аб задачах журналістаў рэспублікі ў барацьбе за выкананне рашэнняў XXI з'езду КПСС.

2. Аб выніках абмеркавання праекта статута Саюза журналістаў СССР на абласных канферэнцыях і прапановах па праекту статута.

3. Выбары праўлення Саюза журналістаў БССР.

4. Выбары рэвізійнай камісіі Саюза журналістаў БССР.

5. Выбары дэлегатаў на 1-ы Усесаюзны з'езд журналістаў СССР.

Па першаму пытанню парадку дня з дакладам выступіў старшыня аргбюро Саюза журналістаў БССР М. Я. Філімонаў.

З дакладам па другому пункту парадку дня з'езду выступіў член аргбюро Саюза журналістаў БССР А. Ф. Барушка.

Пасля дакладаў разгарнуліся спрэчкі.

6 сакавіка на з'ездзе прадаўжаліся спрэчкі.

З прамовай на з'ездзе выступіў сакратар ЦК КПБ Ц. С. Гарбуноў.

З'езд выбраў праўленне Саюза журналістаў, рэвізійную камісію і дэлегатаў на Усесаюзны з'езд журналістаў.

(БЕЛТА).

———

## Выстаўка, прысвечаная жаночаму дню

У чытальнай зале Дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна арганізавана вялікая выстаўка, прысвечаная Міжнароднаму жаночаму дню 8 сакавіка. На ёй можна пазнаёміцца з артыкуламі, брашурамі і фотаматэрыяламі, якія расказваюць пра жыццё і працоўныя поспехі савецкай жанчыны. Сярод іх — брашуры «Жанчына ў барацьбе за мір» Н. Паповай, «Шлях савецкай сялянкі» Т. Новікавай, «Што дала Кастрычніцкая рэвалюцыя жанчынам Беларусі» А. Ус і інш.

На асобным стэндзе выстаўлены мастацкія творы, прысвечаныя жанчынам.

Выстаўкі, прысвечаныя жаночаму дню, арганізаваны таксама ў абласной бібліятэцы імя Пушкіна і шматлікіх рабочых клубах сталіцы.

# ПАВЕДАМЛЕННЕ

## *Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Савет Беларускай ССР*

## Аб выніках выбараў у Вярхоўны Савет Беларускай ССР 1 сакавіка 1959 г.

1 сакавіка 1959 года ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР.

У гэты дзень адначасова праходзілі выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Галасаванне паўсюды пачалося своечасова і арганізавана ў 6 гадзін раніцы, закончылася ў 12 гадзін ночы і праходзіла ў строгай адпаведнасці з выбарчым законам.

Выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных праходзілі ў абстаноўцы высокай палітычнай і працоўнай актыўнасці працоўных, выкліканай гістарычнымі рашэннямі XXI з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза—з'езду будаўнікоў камунізма. Выбары выліліся ва ўсенароднае свята, яркую дэманстрацыю яднання Камуністычнай партыі, Савецкага ўрада і народа.

Цэнтральная выбарчая камісія на працягу 2 і 3 сакавіка атрымала ад усіх акруговых выбарчых камісій канчатковыя даныя аб выніках выбараў у Вярхоўны Савет Беларускай ССР.

Агульная колькасць выбаршчыкаў у цэлым па Беларускай ССР вызначылася ў 5 335 249 чалавек. У выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларускай ССР прыняло ўдзел 5 334 105 чалавек, або 99,98 працэнта ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Ва ўсіх выбарчых акругах па выбарах у Вярхоўны Савет Беларускай ССР за кандыдатаў народнага блоку камуністаў і беспартыйных галасавала 5 327 345 чалавек, што складае 99,87 працэнта ад агульнай колькасці выбаршчыкаў, якія ўдзельнічалі ў галасаванні. Супраць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР галасавалі 6 734 чалавекі. На падставе артыкула 79 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Савет БССР 26 бюлетэняў прызнаны несапраўднымі.

Цэнтральная выбарчая камісія разгледзела матэрыялы па кожнай выбарчай акрузе ў паасобку і на падставе артыкула 38 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Савет Беларускай ССР зарэгістравала выбранне дэпутатаў у Вярхоўны Савет Беларускай ССР па ўсіх выбарчых акругах.

У Вярхоўны Савет Беларускай ССР выбрана 407 дэпутатаў.

Сярод выбраных дэпутатаў 149 жанчын, або 36,6 працэнта, членаў і кандыдатаў у члены КПСС 278 чалавек, або 68,3 працэнта, беспартыйных 129 чалавек, або 31,7 працэнта. Рабочых і калгаснікаў — 192 чалавекі, або 47,2 працэнта.

# Заклік партыі — бліжэй да жыцця

Вялікія мэты і задачы, пастаўленыя XXI з'ездам КПСС перад нашай краінай, якая ўступіла ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства, маюць у сабе магутную натхняючую сілу. Разам з усім савецкім народам шматлікі атрад дзеячоў мастацтва і літаратуры напоўнены гарачым жаданнем унесці свой дастойны ўклад у ажыццяўленне сямігадовага плана. Вось аб гэтым ішла гутарка на адкрытым партыйным сходзе беларускіх кампазітараў, прысвечаным вынікам XXI з'езду КПСС і задачам Саюза кампазітараў БССР у святле яго рашэнняў.

Дакладчык — старшыня праўлення саюза **Я. Цікоцкі**—гаварыў аб тым, якая вялікая роля належыць нашым кампазітарам і музыкантам-выканаўцам у справе камуністычнага выхавання працоўных, у фармаванні ў іх добрых эстэтычных густаў, у развіцці і ўзбагачэнні духоўнай культуры савецкага грамадства. У сувязі з гэтым, сказаў Я. Цікоцкі, мы павінны пастаянна памятаць аб закліку партыі — быць бліжэй да жыцця, ісці ў нагу з народам, стаць сапраўднымі выразнікамі яго дум і спадзяванняў. Дакладчык ухваляе імкненне кампазітара М. Аладава, які адлюстроўвае ў сваёй другой аркестравай сюіце пачуццё гордасці савецкіх людзей за сваіх вучоных і рабочых, якія стварылі і запусцілі на загадзя зададзеную арбіту першыя ў свеце штучныя спадарожнікі Зямлі і касмічную ракету.

На сходзе гаварылася аб намечаным на красавік правядзенні Трэцяга з'езду кампазітараў Беларусі, праграмах канцэртаў, якія ў асноўным будуць складацца з новых твораў аб нашым сённяшнім жыцці. Праўда, як адзначаў Я. Цікоцкі, складаць гэтыя праграмы цяжка, таму што сучасная тэматыка яшчэ не заняла цэнтральнага месца ў творчасці беларускіх аўтараў. Дакладчык заклікаў жалег па рабоце часцей выязджаць у калгасы, на прадпрыемствы і новабудоўлі рэспублікі, больш сустракацца з народам, каб больш дасканала адлюстроўваць у музычных творах сучаснасць, гераічныя будні нашага часу.

Аб тым, як глыбей пазнаваць і ярчэй увасабляць у музычным мастацтве сучаснае жыццё, гаварылі на сходзе музыказнаўца **І. Нісневіч**, паэты-песеннікі **А. Русак, А. Астрэйка**. Яны выказалі ў сваіх прамовах вялікую трывогу за страту некаторымі кампазітарамі і выканаўчымі калектывамі Беларусі сапраўднага пачуцця сучаснасці і аператыўнасці.

Удзельнікі самадзейнасці і прафесіянальныя артысты з поўнай падставай скарджацца на адсутнасць новых масавых песень аб героях сённяшняга дня; няма новых музычных партытур і для Беларускага аркестра народных інструментаў. На гэта звярнула ўвагу кампазітараў работнік Упраўлення па справах мастацтва **Л. Доўнар-Запольская**. Паэт **А. Бачыла** падзяліўся думкамі аб стварэнні нацыянальных оперных лібрэта, у жанры якіх ён набыў ужо некаторы вопыт. **Ю. Семяняка** заклікаў усіх членаў саюза ўдзельнічаць у творчых сустрэчах кампазітараў з рабочымі і калгаснікамі.

На сходзе выступілі таксама кампазітары **Д. Камінскі, С. Аксакаў, Э. Тырманд.**

# Другі нумар альманаха

Калі ў першыя гады пасля вайны літаратурнае аб'яднанне гродзенскіх пісьменнікаў толькі складвалася, то зараз тут працуе атрад здольных літаратараў, творчасць якіх з кожным годам усё мацней гучыць у беларускай літаратуры. Аб гэтым сведчыць і новы нумар літаратурнага альманаха «Нёман», які выйшаў з друку ў канцы мінулага года.

Як і ў першым нумары (1956 г.), значную частку альманаха складае мастацкая проза. Тут змешчана аповесць А. Карпюка «У маладыя гады», апавяданні В. Быкава «Трое» і «Страчаныя мары», нарысы аб подзвігах савецкіх людзей у барацьбе за Савецкую ўладу, аб сучасным жыцці працаўнікоў вобласці.

Найбольш дасканалая ў мастацкіх адносінах аповесць «У маладыя гады». Аляксей Карпюк вядомы беларускаму чытачу па кнізе «Дзве сасны», якая не так даўно выйшла ў Дзяржаўным выдавецтве БССР, па апавяданнях і нарысах, якія друкаваліся на старонках рэспубліканскіх часопісаў. Яго новая аповесць сведчыць аб значным творчым росце аўтара. Твор вызначаецца арыгінальнай і чоткай кампазіцыйнай пабудовай, добрай псіхалагічнай распрацоўкай вобразаў, сакавітай мовай. Аўтар цікава арганізаваў сюжэт аповесці, у творы няма амаль нічога лішняга, падзеі развіваюцца дынамічна і востра. Усхвалявана намаляваны вобразы герояў—генералавай дачкі Крысі і сялянскага хлопца беларуса Янака, што пакахалі адно аднаго горача і шчыра са ўсёй сілай маладосці, і пранеслі гэтае чыстае каханне праз усе выпрабаванні жыцця.

«У маладыя гады»—гэта перш за ўсё аповесць аб людзях. Героі твора жывуць і дзейнічаюць у блізкай сувязі з жыццём. Яны — сведкі і ўдзельнікі ўсіх падзей, якія адбываюцца на працягу амаль дваццаці год. Мы бачым барацьбу беларускай моладзі за свае правы ва ўмовах панскай Польшчы, бачым, як у гады Айчыннай вайны людзі змагаліся з ворагам. І ўсё гэта добра звязана асноўнай сюжэтнай лініяй—гісторыяй асабістых адносін герояў, гісторыяй іх рамантычнага, самаадданага кахання, якое дапамагае Янку Барташэвічу ў барацьбе з ворагам, прымушае дзяўчыну пайсці на подзвіг у імя ідэалаў, што сталі мэтай і яе жыцця.

Ёсць, вядома, у аповесці і недахопы. Часам апавядальнік залішне любуецца сабой, асобныя моманты ў апісанні герояў гучаць недастаткова пераканаўча. Вось, напрыклад, герой упершыню «па-гарадскому» прычосваецца... «Ад змененага твару на мяне павеяла такой навізной, што я не мог на сябе наглядзецца... Увесь свет пахарашэў. Мне здалося, што ўся Вільня таксама перажывае маё паўторнае нараджэнне! Выйшаўшы на вуліцу з чубам, я сустракаўся з такімі, як сам, хлопцамі, як роўны з роўным. Ад самаўпэўнення малавартасці не засталося і следу. Я ішоў і незалежна прыглядаўся да людзей».

Вядома, нешта падобнае, можа, і адбывалася ў душы героя, але аўтар, мабыць, упадае ў перавялічэнне. На шчасце, такіх моментаў у аповесці нямнога. Затое ёсць шмат старонак, напісаных сапраўды памайстэрску, праўдзіва і пераканаўча. Аповесць чытаецца з хваляваннем, выклікае добрыя роздумы і пачуцці.

Звяртаюць на сябе ўвагу ў альманаху два апавяданні Васіля Быкава. Першае з іх—«Трое»—гэта твор аб сіле, духу і мужнасці, аб высокіх маральных якасцях савецкага чалавека, якія яскрава праявіліся ў час Айчыннай вайны. Сюжэт яго просты. Знясіленыя, параненыя і галодныя воіны ўцякаюць з варожага палону. Здаецца, толькі жалезная воля, нястрымная прага да жыцця дапамагае ўцекачам трымацца на нагах. І вось іх зноў даганяюць ворагі. Аўтар у асноўным паказвае трох палонных і трох ворагаў. Усе яны маюць розныя характары, парознаму дзейнічаюць ў тых абставінах, якія склаліся. Па-геройску, пражыўшы слаўнае жыццё, гіне камісар, кідаючы ў твар ворагам апошнія словы нянавісці. Ворагі расстрэльваюць аслабелага Івашова, які думаў цаной здрадніцтва купіць сабе жыццё. Толькі нязломная мужнасць, сама святая нянавісць да ворагаў ратуе апошняга з уцекачоў—Валодзькіна: адзін з канваіраў, здзіўлены яго стойкасцю і ўпартасцю, дапамагае яму ўцячы. У драматычным, напружаным дзеянні добра раскрываюцца характары, праяўляюцца розныя маральныя якасці.

Другі твор В. Быкава—апавяданне «Страчаныя мары» прысвечана сённяшняму жыццю. Аўтар ставіць пытанне аб адносінах чалавека да працы, да жыцця, пераканаўча даводзіць, што толькі самаадданая праца на карысць людзей прыносіць чалавеку сапраўднае шчасце і задавальненне. Страчаныя мары—гэта мара дзяўчыны, што выйшла замуж за дамаседа, які задавальняецца дробнымі асабістымі справамі, стварэннем маленькага «шчасця» ў цілім і ўтульным хатнім кутку ў той час, калі вакол імкліва ідзе жыццё з сапраўднымі творчымі радасцямі, з вялікімі магчымасцямі для ажыццяўлення самых рамантычных мараў.

На жаль, жанр апавядання прадстаўлены ў альманаху толькі гэтымі двума творамі. Між тым на Гродзеншчыне ёсць шмат празаікаў, якія спрабуюць свае сілы ў жанры апавядання. Трэба было смялей прыцягваць творчую моладзь да ўдзелу ў альманаху, каб раздзел апавяданняў быў больш разнастайны і па тэматыцы.

Значна шырэй прадстаўлены ў зборніку нарысы. У гэтым раздзеле даволі яскрава адлюстроўваецца сучаснае жыццё вобласці, паказваюцца людзі, якія жывуць і працуюць у ёй, якія змагаліся на Гродзеншчыне за волю і незалежнасць Радзімы. Цікавыя пытанні закранае ў сваіх творах Ларыса Марушка. У яе нарысе «Жывое слова» паказваецца праца агітатара, які нясе ў масы тое жывое слова, што дапамагае знайсці шлях да сэрцаў людзей, заслужыць аўтарытэт і павагу калгаснікаў. Л. Марушка знайшла трапныя жыццёвыя дэталі, якія дапамагаюць вырашыць тэму цікава і пераканаўча.

Другі нарыс Л. Марушкі («Родны край») слабейшы ў мастацкіх адносінах. У ім няма ярка выражанай тэмы, стройнай сюжэтнай лініі. У пачатку здаецца, што аўтар пакажа складаную працу настаўнікаў, якія выхоўваюць у вучняў любоў да роднага краю, раскажа аб тым, як Васіль Пілімавіч знаходзіць ключ да сэрцаў хлапчукоў і дзяўчынак. Але потым увага аўтара распыляецца, ён забывае пра настаўніка, пра школу і заканчвае нарыс расказам аб пераўтварэннях ў вёсцы, аб тым, што адзін з вучняў—Юра—зацікавіўся электрычнасцю. Ёсць у нарысе подых часу, ёсць цікавыя назіранні, але вобразы людзей цьмяныя, павярхоўныя.

Аб працы пасланцоў партыі ў вёсцы апавядае нарыс В. Салдатава «Выпадковая сустрэча». Вобраз старшыні калгаса Паўла Фёдаравіча паказаны цікава і разнастайна. Адчуваецца, што аўтар добра ведае калгаснае жыццё і ўмее расказаць аб ім цікава і глыбока.

Гэты раздзел альманаха дапаўняюць нарыс Л. Герасімава аб подзвігу пагранічнікаў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны і дарожныя нататкі А. Сініцава «Па Нёману».

Ёсць у альманаху асобны раздзел «Нашы знатныя землякі», дзе змешчаны артыкулы пра Кастуся Каліноўскага, пра вядомага вучонага акадэміка А. Ф. Карскага, пра саратніка Каліноўскага, а потым вядомага генерала Парыжскай Камуны Валерыя Урублеўскага. Добра было б, каб побач з гэтымі матэрыяламі ў зборніку знайшлі месца і нарысы аб знатных людзях, якія сёння ствараюць і памнажаюць славу Гродзеншчыны.

Каля дваццаці аўтараў выступілі ў альманаху з вершамі. Па сваёй тэматыцы, па ідэйных задумах паэтычныя творы не выклікаюць нараканняў. Аўтары пішуць аб партыі, аб Радзіме, аб прыгажосці роднага краю, аб радасці творчай працы, аб хараство сучаснага жыцця. Аднак у мастацкіх адносінах большасць з іх напісана слаба, гучыць дэкларацыйна. Адчуваецца, што паэты вельмі мала шукаюць новых выражэнняў, новых паэтычных сродкаў. Сярод добрых твораў можна назваць вершы «З табою партыя!» С. Бандарэнкі, «Мая Радзіма» В. Аляхновіча, «Радзіма» Д. Бічаль, «Наступіла пара» М. Ільінскага, «Маці героя» А. Сідаровіч, «Айчыне» М. Навакшэнава, а таксама некалькі вершаў М. Васілька аб прыродзе. А ўсё ж у зборніку каля сарака вершаваных твораў!

Радка сустрэнеш у вершах трапную, яскравую дэталь, свежы вобраз, удалае параўнанне. Ёсць вершы наогул не сталыя, якія наўрад ці трэба было ўключаць у зборнік. Што, напрыклад, скажа сэрцу і розуму чытача верш І. Юшчанкі «Пры сустрэчы»? Дзяўчына чакае каханага («Жмет (?) она в своей руке платочек, голову (?!) вытягивает вверх...»), потым яны сустракаюцца, цалуюцца. І ўсё! Праўда, аўтар ставіць у канцы клічнік: «Как не позавидовать их встрече, их богатству сокровенных чувств!» Але чытач не знойдзе ў вершы ні «богатства сокровенных чувств», ні наогул таго, чаму можна было б пазайздросціць. Слабыя, кніжныя і два астатнія вершы І. Юшчанкі. Той, хто рэдагаваў зборнік, павінен быў больш папрацаваць з аўтарам.

Наогул жа другі нумар альманаха «Нёман» пахазвае, што на Гродзеншчыне ёсць здольныя літаратурныя сілы, якія з кожным годам памнажаюцца і мацнеюць. Да таго ж ў вобласці можна было б выдаваць такія зборнікі значна часцей, хаця б раз у год. Гэта садзейнічала б далейшаму творчаму росту літаратараў Гродзеншчыны, якія павінны ў наступным альманаху больш ярка і глыбока адлюстраваць нашу яскравую рэчаіснасць.

**А. ШАЎНЯ.**

Нядаўна ў Лідзе адкрылася дзіцячая бібліятэка. У ёй працуюць чытальная зала і абанементны аддзел. Кніжны фонд бібліятэкі перавышае 18 тысяч экземпляраў разнастайнай літаратуры. Паслугамі бібліятэкі карыстаецца ўжо каля тысячы дзяцей.

**На здымку:** у абанементным аддзеле. Бібліятэкар Антаніна Кукліна (справа) выдае дзецям кнігі.

Фота **І. Лабко.**

# Новы спектакль

**«Млын на Сініх Вірах» Ул. Караткевіча—драма. У яе аснове—«будні» партызанскай барацьбы. Трагедыя вайны, трагедыя абставін, якія склаліся на пэўным участку барацьбы народа супраць захопнікаў.**

**Увага драматурга сканцэнтравана, калі можна так сказаць, на «буйных дробязях», ад якіх залежыць вынік асноўных партызанскіх аперацый.**

**У адным з беларускіх гарадоў, над якім навісае пагроза акупацыі, партыя арганізоўвае падполле. Пакуль ідуць баі за горад—вырашаецца пытанне аб забеспячэнні партызан і насельніцтва партызанскай зоны хлебам. Зерне назапашана. Але яго трэба малоць. У адной з патаемных лясных мясцін ёсць млын на Сініх Вірах. Сюды пасылаюцца на працу Асінскі, яго дачка Марыся і Віктар Сміхальскі, якога Марыся кахае. Гаспадаром явачнай кватэры ў горадзе застаецца вучоны-краязнаўца Дзюбка. Вораг займае горад. Усе далейшыя падзеі звязаны з барацьбой за млын на Сініх Вірах, а г. зн.— за хлеб. Вораг, у што б там ні было, імкнецца знайсці млын, які забяспечвае партызан мукой.**

**Асноўны канфлікт п'есы крыецца глыбока ў псіхалогіі персанажаў. Віктар Сміхальскі, якога прызначылі на млын у дапамогу Асінскаму, і Андрэй Лаўрановіч, што ажыццяўляе сувязь між млынам, канспіратыўнай кватэрай у Дзюбкі і атрадам, абодва кахаюць Марысю. Дзяўчыне спачатку больш падабаецца Віктар, а Андрэй для яе—проста сябра дзяцінства. Але ход падзей, якія разгарнуліся ў час, найбольш небяспечны для падпольшчыкаў, праяўляе характары хлопцаў. Віктар—эгаіст, фразёр і баязлівец. Трапіўшы ў складаныя абставіны, ён выдае ворагу і Андрэя, і сваю каханую—Марысю. Андрэй жа, які заўсёды заставаўся верным свайму каханню да Марысі і справе, за якую яны змагаліся,—чалавек сціплы і самаадданы, мужна пераносіць катаванні, якім падвяргаюць яго фашысты, гнеўна выкрывае здрадніка. Ён і Марыся гінуць, не сказаўшы фашыстам ні слова аб размяшчэнні партызан.**

**Не толькі Марысі даводзіцца рабіць у гэтым дачыненні «перацэнку каштоўнасцей» у суровы і грозны для Радзімы час. Старшыня гарвыканкома Каляда пановаму пачынае ставіцца да людзей, калі абставіны прымусілі яго параўнаць былога кулака Трубайлу, які перайшоў на службу да ворага, спадзеючыся вярнуць былы свой маёнтак, і былога злодзея, які ў час вайны задумаўся пра многае і знайшоў нарэшце сваё месца ў барацьбе—пайшоў у партызанскі атрад. Па-іншаму пачынае глядзець Каляда і на знахарку Тэклю. Калісьці яна пацярпела ад Савецкай улады, а ў цяжкую для радзімы хвіліну забылася на асабістую крыўду. Яна, рызыкуючы жыццём, атруціла фашысцкіх афіцэраў, якія даведаліся ад Трубайлы пра месцазнаходжанне млына на Сініх Вірах. Вучоны Дзюбка забівае фашысцкага прыхвасня Трубайлу. Для інтэлігента Дзюбкі нялёгка было адважыцца «сваімі рукамі» забіць чалавека, хоць і ворага. Сярод нямецкага афіцэрства, паказанага ў п'есе, ёсць скептык Адлерберг, які сумняваецца ў правільнасці палітыкі фюрэра і паважае народ, супраць якога даводзіцца яму ваяваць.**

**Істотныя недахопы п'есы, якія адбіліся і на якасці спектакля Мінскай тэлестудыі,—гэта, з аднаго боку, перанаселенасць твора персанажамі, а з другога — празмерна расцягнутыя маналогі. Апроч таго, малады драматург не пазбегнуў кампазіцыйнай рыхласці свайго твора. Гэта прывяло да рытмічнай неарганізаванасці тэлеспектакля, што заўважаецца пераважна ў яго другой палавіне. Акцёры «растваравоцца» ў словах у сцэнах у кабінеце Каляды, у варожым штабе, калі фашысцкія пітабісты вядуць занадта многа стратэгічных размоў ля карты, з якіх глядач нічога, па сутнасці, не выносіць, і нават у канцоўцы, калі выканаўца ролі Андрэя вымушаны больш дэкламаваць, чым іграць. Мова ў п'есе і ў спектаклі неапрацаваная, нярэдка сустракаюцца русізмы і неўласцівыя беларускай мове сінтаксічныя канструкцыі.**

**Трэба сказаць, удумлівы падыход рэжысёра В. Карпілава да ўвасаблення п'есы на тэлеэкране пайшоў на карысць спектаклю.**

**Нямала ў спектаклі акцёрскіх удач.**

**[«МЛЫН НА СІНІХ ВІРАХ»].**

———

**У першую чаргу хочацца адзначыць удумлівую ігру В. Белахвосціка (Андрэй), які стварыў цікавы вобраз камсамольца-падпольшчыка, чалавека вернага ў каханні і дружбе, непахіснага ў сваіх перакананнях, патрыёта Радзімы. Выканаўца прадэманстраваў досыць багатую палітру фарбаў для абмалёўкі характару свайго героя.**

**Бацьку Марысі — Асінскага іграе А. Ліхач. Асабліва ўдаліся яму сцэны з Марысяй на млыне. Ул. Говар-**

**Бандарэнка стварыў прывабны вобраз вучонага-патрыёта Дзюбкі, хоць дзе-ні-дзе ён карыстаецца і параўнальна не новымі фарбамі. Аднак вобраз гэты праігрывае ў спектаклі таму, што ў п'есе ён выглядае чужародна, цесна не звязаны з падзеямі твора. Цудоўная беларуская жанчына, чалавек надзвычай багатай душы—такой запамінаецца знахарка Тэкля ў выкананні Г. Макаравай.**

**Запамінаюцца ў спектаклі С. Бірыла (Аллерберг), А. Навасельскі (Швальбе), З. Стома (Трубайла), Б. Уладамірскі (дыктар гарадскога радыёвузла Ветка, які загінуў на сваім пасту), К. Казакова ў маленькай эпізадычнай ролі бежанкі, К. Сянкевіч (Каляда), які здолеў стварыць цікавы вобраз на не вельмі багатым матэрыяле ролі, і іншыя. Залішне шаржыраваны ролі высакароднага злодзея (І. Лапцінскі) і ефрэйтара Крашке (А. Трэпель).**

**Асобна неабходна спыніцца на ролях Інзельвальдэ, Віктара і Марысі. Л. Казлоўскі (Інзельвальдэ) не здолеў данесці багаты падтэкст сваёй ролі ў сцэне, калі нямецкі афіцэр Інзельвальдэ загадвае расстраляць Віктара, каб той не выдаў яшчэ каго-небудзь з падпольшчыкаў. Дарэчы, у гэтай сцэне варта было твар Інзельвальдэ даваць буйным планам у момант, калі ён заяўляе: «Здра прымаюць, а здрадніка забіваюць». В. Тарасаў малюе Віктара даволі а настайнымі фарбамі, абмяжоўваецц просталінейным паказам характа свайго персанажа. Вылучаюцца ігры Тарасава толькі сцэна ў кра Дзюбкі і момант, калі Віктар імкне ца апраўдаць свой эгаізм і баяз ваецца нежаданнем паміраць «дзе цічасця людзей трыццатага стаго дзя».**

**Л. Старадумава (Марыся) іграе няроўна. Да гэтага мы бачылі яе в двух тэлеспектаклях («Ля сіні бухты» і «Сымон-музыка»). У гэтым спектаклі артыстка не толькі паўтарае знойдзенае раней, але і не заўсёды ў дастатковай ступені пераўвасабляецца ў сваю гераіню. Гэта адчуваецца хоць бы ў тым, што яе Марыся амаль аднолькава ставіцца як да Віктара, так і да Андрэя. У ёй не відаць глыбокага пералому, які павінен быў адбыцца.**

**Удала выкарыстаны кадры кінахронікі і кіназдымкі асобных сцэн тэлеспектакля. Заслугоўваюць станоўчай ацэнкі работа аператараў студыі, мастака В. Казлова, музычнае афармленне і песні маладога кампазітара А. Дудзіна.**

**Нельга не зрабіць адну агульную заўвагу—тэатральны калектыў студыі павінен дамагацца стабільнасці свайго складу. Добра, што пастаянна іграюць у ім Л. Старадумава, К. Казакова, А. Ліхач і іншыя. Пры стабільным складзе асноўных выканаўцаў гэты калектыў зможа ставіць перад сабой сур'ёзныя творчыя задачы. Аб гэтым сведчыць поспех спектакляў «Сымон-музыка» і «Млын на Сініх Вірах».**

**Ул. БОЙКА.**

□

**На здымку:** сцэна з тэлеспектакля. У ролях: Андрэй — **В. Белахвосцік**, Асінскі — **А. Ліхач**, Марыся — **Л. Старадумава.**

Фота **Ул. Крука.**

# Удзячнасць гледачоў

— Бараноўскі прыехаў! — гэтая вестка хутка абляцела ўсе дамы калгаснікаў вёскі Рубель Давыд-Гарадоцкага раёна. А ўвечары калгаснікі і сельская інтэлігенцыя ішлі ў калгасны клуб паглядзець фільм «Сцягі на вежах».

Гасне святло. Пачулася мернае патрэскванне кінаапарата.

Дзевяць год працуе Канстанцін Бараноўскі механікам сельскай кінаперасоўкі. За ўвесь гэты час у яго не было выпадку спазнення, апаратура заўсёды дзейнічае бездакорна. У мінулым годзе тав. Бараноўскі датэрмінова выканаў вытворчы план кінаабслугоўвання сельскага насельніцтва на 107,6 працэнта.

Кожную новую кінакарціну хлебаробы глядзяць з вялікай цікавасцю. За апошні час калгаснікі прагледзелі фільмы «Васемнаццаты год», «Смерць веласіпедыста», «Гэта не павінна паўтарыцца», «Разбітыя мары», «Андрэйка» і інш.

Сеанс закончаны. Канстанцін Сцяпанавіч гутарыць з гледачамі, пытаецца, як яны зразумелі фільм, растлумачае асобныя месцы.

— Дзякуем, Канстанцін Сцяпанавіч, за добрую карціну,—гавораць гледачы.—Прыязджай да нас часцей!

**П. ЛІПСКІ.**

Нядаўна ў Лідзе адкрылася дзіцячая бібліятэка. У ёй працуюць чытальная зала і абанементны аддзел. Кніжны фонд бібліятэкі перавышае 18 тысяч экземпляраў разнастайнай літаратуры. Паслугамі бібліятэкі карыстаецца ўжо каля тысячы дзяцей.

**На здымку:** у абанементным аддзеле. Бібліятэкар Антаніна Кукліна (справа) выдае дзецям кнігі.

Фота **І. Лабко.**

# Вывучаць народную мудрасць

Народная мудрасць — прыказкі, прымаўкі, жарты, каламбуры, удалыя фразеалагічныя выразы, народныя сюжэты, вобразы і матывы — заўжды жывіла і жывіць творчасць нашых лепшых пісьменнікаў.

Паспяхова выкарыстоўваць фальклор можа пісьменнік, які не толькі ведае народную мудрасць тэкстуально, але і знаёмы з яе гісторыяй і тэорыяй. А без тэорыі прадмета, па думцы Чарнышэўскага, няма і яго гісторыі. Прыкладам у гэтых адносінах можа служыць творчая і навуковая дзейнасць акадэміка К. Крапівы; сакрэт умелага выкарыстання ім народнага афарызма — у глыбокім веданні пісьменнікам умоў ужывання ў народзе той ці іншай прыказкі, прымаўкі або фразеалагізма. Удумліва і глыбока прааналізаваў К. Крапіва ў рабоце «Беларускія прыказкі» не толькі тэматыку, але і мастацкія асаблівасці гэтага жанра вуснай паэтычнай творчасці народа.

Шкада, што такіх каштоўных работ у беларускай лінгвістыцы і фальклярыстыцы далёка недастаткова. Не раз адзначалася ў друку неабходнасць даследаванняў беларускіх народных прыказак, прымавак і іншых жанраў фальклору. Нельга не падзяліць думку Дзм. Малдаўскага, які ў часопісе «Советская Отчизна» № 3 за 1958 г. зазначае: «Нават першае знаёмства з беларускімі народнымі прыказкамі і прымаўкамі (гутарка ідзе аб зборніку прыказак і прымавак Ф. Янкоўскага пад рэдакцыяй М. Судніка.—**Ул. Б.**) гаворыць аб тым, што перад намі матэрыял, здольны значна ўзбагаціць мову і пісьменніка і чытача, здольны натхніць вучонага на спецыяльную даследчую работу. Якой цікавай была б праца, якая прасачыла б хаця некаторыя заканамернасці ўзнікнення народных афарызмаў» (стар. 192).

Але, як кажуць, гукай — дагукаешся, чакай — дачакаешся. Выйшла кніга супрацоўніка Інстытута мовазнаўства АН БССР А. Аксамітава «Лексіка беларускіх прыказак XIX стагоддзя ў сувязі з агульнай праблемай фразеалогіі» (рэдакцыя акадэміка П. Глебкі).

Загаловак уступу да кнігі — «Прыказка — фокус навакольных з'яў»—вельмі лаканічна вызначае ролю прыказкі і шляхі яе ўтварэння. У цэнтры ўвагі аўтара праблемнае пытанне: у чым прычына, сутнасць той з'явы, што ў прыказках, як зазначае аўтар, «словам песна, а думкам прасторна». Па-свойму, дасціпна і глыбока аўтар гаворыць аб ролі прыказак у мове, гісторыі іх утварэння і мастацкіх асаблівасцях, аналізуе лексіку і паказвае шляхі ўтварэння з прыказак фразеалагічных выразаў.

Як жа ўтвараюцца гэтыя мініятурныя і гранічна завершаныя творы?

Дасціпнае назіранне над жыццёвымі фактамі прыводзіць людзей да вываду, які можна прыстасаваць да іншых аналагічных выпадкаў, і гэты вынік—заключэнне — набывае ролю прыказкі, ёй давяраюць, ёю кіруюцца ў жыцці. У гэтым трэба бачыць яе асноўнае прызначэнне. А ўжыванне прыказкі кладзе адбітак на яе мастацкія асаблівасці, асноўная з якіх—вобразнасць. Праўда, ёсць нямала прыказак і не вобразных. Відаць, іх утварэнне і бытаванне тлумачыцца тым, што яны даюць адказ, параду, апраўдваюць ці ганьбяць шэраг аднолькавых з'яў ці абставін. Адно можна з упэўненасцю сказаць: не будзе прыказкай выказванне, якое не можа пацвярдзіць на многія аналагічныя з'явы ў жыцці ці яшчэ не набыло гэтай уласцівасці.

Прыказкам, прымаўкам і іншым відам народных «крылатых» слоў найменш уласціва статычнасць; яны пастаянна абнаўляюць сваю лексіку. Кожны крок развіцця мовы непасрэдна і адразу адбіваецца ў іх, а архаізмы, якія часам утрымліваюцца, набываюць новы сэнс. І нельга не пагадзіцца з аўтарам, калі ён зазначае, што рухомасць лексічных адзінак прыказак і прымавак стварае ўмовы лёгкага засваення апошніх мастацкімі творамі без усякіх змен, чаго нельга сказаць аб іншых жанрах фальклору.

Пры аналізе лексікі прыказак XIX ст. аўтар выкарыстоўвае вялікі фактычны матэрыял, сочачы за яе развіццём ад перыяду старажытнасці (X—XIII ст.) да сённяшняга дня і паказваючы лёс таго або іншага слова ў сучаснай мове.

Сацыяльная лексіка прыказак дае поўнае ўяўленне аб светаўспрыйманні беларускага народа на працягу стагоддзяў, аб ацэнцы тых сацыяльных з'яў, якія запоўнілі яго гісторыю. Лексіка гэтай групы ілюструе, па выразу Ул. І. Леніна, псіхалогію народа. Важна адзначыць, што ўвагу даследчыка прыцягваюць не абы якія словы з сацыяльнай лексікі, а тыя, што больш за ўсё характарызуюць класавую барацьбу беларускага народа супраць прыгнятальнікаў: пан, цар, поп, кёндз, войт, соцкі, бог, чорт, шчасце, доля, свет, грэх, народ, век і г. д.

На аснове аналізу лексікі даследчык прыйшоў да вываду, што без істотных змен захавалася тая частка яе, якая ўваходзіла ў асноўны слоўнікавы фонд * старажытнай рускай мовы.

Прыказкі адыгрываюць «больш актыўную ролю ў параўнанні з іншымі жанрамі вуснай народнай творчасці ў фармаванні нацыянальнай мовы» (стар. 54). Яны (прыказкі) шырока вядомы і карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў народзе. І калі паўстае пытанне пра ўжыванне таго ці іншага слова, мы не раз заглядаем у прыказкі. Нярэдка ў прыказках можна сустрэць слова, якое ўтварылася разам з прыказкай і, бадай, асобна не ўжываецца. «Другой асаблівасцю слоўніка беларускіх прыказак,—гаворыць К. Крапіва,—з'яўляецца досыць значная колькасць наватвораў» (Збор твораў, т. 2, стар. 413). Звернемся да прыкладаў: «З языковага мліва мука **негадзіва**»; «Гаспадарка — **калатарка**».

Цяжка сказаць, які далейшы лёс падобных слоў. Але, нажаль, гэтага пытання даследчык не закрануў.

Нельга ставіць у заслугу чалавеку тое, што ў яго валасы цёмныя ці светлыя, таксама не заўсёды трэба хваліць пісьменніка за наяўнасць у яго творах фальклорных сюжэтаў, вобразаў, прыказак, прыманак, параўнанняў і інш. Часам падобныя «ўстаўкі» выглядаюць у творы «белымі варонамі». Пра ўжыванне ў мове малых жанраў фальклорных элементаў А. Аксамітаў гаворыць, што іх трэба ўплятаць у твор так, каб яны маглі служыць вынікам, падагульненнем, згусткам палажэнняў і фактаў. Афарызм «... як бы ў сціслым выглядзе адлюстроўвае галоўную сутнасць гэтых фактаў, іх ідэю, з'яўляецца канцэнтраваным згусткам папярэдняга апавядання. Як мараль адносіцца да байкі, так прыказка да сваёй апавядальнай крыніцы. Гэты завяршаючы вывад перадае сутнасць усёй з'явы, яе характар» (стар. 5).

Пытанні ўзаемаадносін мастацкай літаратуры і фальклору былі пастаўлены на парадак дня ў мінулым стагоддзі. У свой час В. Бялінскі гаварыў: «Народнасць» ёсць альфа і амега эстэтыкі нашага часу, як «упрыгожанае перайманне прыроды» было альфай і амегай эстэтыкі мінулага стагоддзя» (Поўны збор твораў, т. 5, Масква, 1954, стар. 289). Аднак у паняцце «народнасць» прадстаўнікі розных школ навукі і літаратуры ўкладвалі розны сэнс. Часцей гэта былі пагардлівыя адносіны да народа і яго мудрасці, няправільнае разуменне задач і метадаў асваення ў мастацкай літаратуры вечна жывой народнай мудрасці.

Пытанне творчага асваення пісьменнікамі вуснай паэзіі народа ў цэлым і паасобных яе жанраў як у беларускай, так і ў іншых братніх літаратурах патрабуе свайго далейшага вывучэння.

Пытанні лексікалогіі ў беларускім мовазнаўстве да апошняга часу зусім не распрацоўваліся. Таму, прысвяціўшы работу такой важнай праблеме, А. Аксамітаў паклаў тым самым пачатак яе вывучэнню. З пастаўленай задачай даследчык нядрэнна справіўся, кніжка паслужыць добрым дарадчыкам пісьменніку, літаратурнаму крытыку, мовазнаўцу і фалькларысту.

Ад слова да вобраза — так можна выказаць асноўны напрамак гэтай кнігі. Бо сапраўды, што такое фразеалагізм? Гэта паэтычны вобраз, сатканы з устойлівага арашчэння слоў. Калі разглядаць прыказкі як адну з асноўных крыніц утварэння ўстойлівых вобразных словазлучэнняў, дык гэта азначае займацца пытаннямі стылю. І, зноў жа, ці могуць нашы даследчыкі фальклору і літаратуры пахваліцца дасягненнямі ў гэтым напрамку? Часцей крытыка абмяжоўваецца ідэйна-тэматычным разглядам твора.

Мы маем не так многа навуковых работ у нашым мовазнаўстве па фразеалогіі і, трэба сказаць, сярод іх вельмі шмат супярэчлівых. Аксамітаву неабходна было вызначыць прынцыпы класіфікацыі і даць сваё азначэнне фразеалагічных выразаў.

Калі гутарка заходзіць аб багатай і развітай той ці іншай мове, то важнейшым аргументам пры гэтым з'яўляецца яе лексічны склад. І сапраўды, чым больш слоўнікавы склад мовы, тым лягчэй знайсці патрэбнае слова ў мове, лягчэй выказаць самыя тонкія і складаныя пачуцці і з'явы. Развіццё мовы ўвесь час ідзе ў напрамку ўзбагачэння лексікі і ўдасканалення граматычнага ладу. Але бывае і так: неабходнасць у новым слове ёсць, ды слова няма. Задаволіць аб'ектыўную неабходнасць у новым слове можна шляхам выкарыстання існуючай лексікі ў новым значэнні. Але новае значэнне слова можа быць зразумела толькі ў сувязі з другімі моўнымі адзінкамі. Так паяўляецца новае адценне слова, новае зрашчэнне-фразеалагізм. З такімі вывадамі аўтара нельга не пагадзіцца. Звернемся да прыкладу: «Ён адвёў вочы яму так, што і камар носа не падточыць». Значэнне прыведзенага сказа можна коратка выказаць: «Ён умела падмануў». Аднак лёгка заўважыць што дзве фразеалагічныя адзінкі («адвёў вочы» і «камар носа не падточыць») не толькі паэтычна аздабляюць выказванне, але дасціпна і ўсебакова характарызуюць сам учынак.

Фразеалагізмы ствараюцца ў мове пастаянна, так як няспынна ўтвараюцца ў ёй новыя словы, якія ў сваю чаргу служаць матэрыялам для новых і новых фразеалагічных адзінак. Іменна так уяўляе аўтар вечны працэс развіцця мовы. Аб шляхах яе ўдасканалення пераканальна гавораць наступныя радкі кнігі: «Прыказкі — залаты фонд народнай мовы—узбагачаюць літаратурную мову новымі паняццямі, шматграннай сінаніміяй фразеалагічных выразаў, якія адыгрываюць вялікую ролю ў стылістыцы» (стар. 79).

Агульнанацыянальная літаратурная мова бярэ свае вытокі з мовы народа, на якой створаны неўміручыя вусна-паэтычныя помнікі. Пачатак мастацтва слова, па выразу Горкага,—у фальклоры.

Ёсць і недахопы ў працы т

# Кузьма Чорны на рускай мове

Бадай, не будзе перабольшаннем, калі скажам, што аднатомнік Кузьмы Чорнага «Выбранае», які выйшаў нядаўна ў Маскве, упершыню па-сапраўднаму знаёміць рускага чытача з творчасцю выдатнага беларускага празаіка, паказвае багацце і шматграннасць яго светлага і жыццесцвярджальнага таленту.

Справа ў тым, што папярэднія выданні твораў К. Чорнага на рускай мове — «Вялікае сэрца» (1947) і «Выбранае» (1950)—мелі надзвычай многа недахопаў у перакладах. Калі пэўнае ўяўленне рускі чытач яшчэ мог атрымаць пра майстэрства К. Чорнага-навеліста, дык пераклады аповесці «Лявон Бушмар», раманаў «Бацькаўшчына» і «Трэцяе пакаленне» не даносілі асаблівасцей мастацкага стылю беларускага празаіка, глыбіню думкі і філасофскую развагу яго твораў. Няўдала прасеяныя праз перакладчыцкае рэшата буйныя творы майстра беларускай прозы ў выданні 1950 г. страцілі свой непаўторны нацыянальны каларыт, арыгінальныя выяўленчыя мастацкія сродкі, надзвычайнае багацце мовы, яркія фарбы, рытміку і музыку сказа. Чытач атрымаў па сутнасці не мастацкі пераклад твораў «Лявон Бушмар», «Бацькаўшчына» і «Трэцяе пакаленне», а толькі вельмі прыблізны пераклад, своеасаблівую адаптацыю аўтарскага тэксту, дзе ні ў якой меры не адчувалася стылёвае багацце прозы Кузьмы Чорнага.

Выдатны знаўца чалавечай душы К. Чорны прыйшоў у беларускую прозу са сваімі тэмамі, праблемамі, цікавымі і яркімі вобразамі, самабытным мастацкім стылем. Уменне па-свойму заглянуць у душу звычайнага чалавека, пераважна селяніна, і паказаць шляхі фармавання і станаўлення яго характару — адметная рыса яго творчасці. К. Чорны паказваў проста і змястоўна суровую праўду жыцця, ствараў жывыя рэалістычныя вобразы, яркія непаўторныя чалавечыя характары. Спакойны і ўраўнаважаны эпічны тон апісання ніколі не парушаецца ў яго раманах танным упрыгожаннем, неспадзяванымі сюжэтнымі паваротамі, усё тут жыццёва і лагічна апраўдана. Аб чым ні пісаў бы К. Чорны, які б ні быў твор—маленькае апавяданне ці манументальны раман-хроніка, заўсёды ў іх ёсць надзвычайная глыбіня думкі, філасофская развага, рэальныя чалавечыя пачуцці, сваё асэнсаванне тэмы.

Вялікі і тонкі знаўца народнай мовы К. Чорны ўвайшоў у беларускую прозу як сапраўдны мастак слова, які многае зрабіў для ўзбагачэння літаратурнай мовы. Творчая спадчына пісьменніка—яскравае сведчанне лексічнага багацця жывой беларускай мовы, гнуткасці і сакавітасці народнага слова. Своеасаблівы лексічны склад мовы ў творах К. Чорнага прадыктаваны імкненнем надаць твору народны каларыт, а сказу — простае і вобразнае гучанне. Якуб Колас пісаў пра мову выдатнага беларускага празаіка: «Вельмі паказальнай у адносінах моўнай дбайнасці, чыстаты, цікавай пабудовы сказаў з'яўляецца пісьменніцкая работа Кузьмы Чорнага... Пісьменнік умеў адкрыць новае гучанне слова, умеў выказаць усё, што турбавала яго, з вялікай дакладнасцю».

Таму нічога няма дзіўнага, што пераклад твораў К. Чорнага на рускую мову, уменне захаваць і перадаць асаблівасці яго стылю, мовы і мастацкіх сродкаў—справа складаная і цяжкая. Тут трэба дасканала ведаць не толькі багатую народную лексіку Случчыны, але адчуць прастату і дынаміку сінтаксічнай будовы сказа з твораў пісьменніка, яго рытміку і музычнае гучанне, праявіць максімум творчай вынаходлівасці, каб знайсці эквівалентную замену цікавым фразеалагізмам, устойлівым словазлучэнням, ідыёмам, беларускім прыказкам і прымаўкам.

Няўдачы перакладчыкаў у папярэдніх выданнях прымушалі насцярожана сустрэць новую кнігу перакладаў твораў К. Чорнага на рускую мову. Можа, зноў перакладчыкі схібілі перад пяжкасцямі і замест мастацкага перакладу даюць пераказ і адаптацыю?

Трэба адразу адзначыць, што калектыў перакладчыкаў у асноўным паспяхова справіўся са сваімі задачамі. Асабліва радуе тое, што непараўнальна лепш, чым у папярэдніх выданнях, зроблены пераклады буйных твораў беларускага пісьменніка, а гэта значыць, што рускі чытач атрымае пэўнае ўяўленне пра характэрныя асаблівасці стылю і мовы К. Чорнага-раманіста, майстра манументальнай прозы.

Але аб майстэрстве перакладаў крыху ніжай, а цяпер хочацца сказаць яшчэ пра адзін момант. Кідаецца ў вочы ўдалы выбар для аднатомніка найбольш цікавых і характэрных твораў К. Чорнага (укладальнікі М. Клімковіч і Р. Рубіна).

Змешчана з багатай спадчыны пісьменніка ў галіне апавядання толькі адзінаццаць твораў гэтага жанра. Яны добра паказваюць эвалюцыю К. Чорнага-навеліста ад лірычных замалёвак, дзе пачуцці і перажыванні герояў засланяюць сабою дзеянне, да глыбока рэалістычных апавяданняў пасмяротнага зборніка «Вялікае сэрца», у якім асабліва ярка паказана суровая праўда жыцця.

Вось апавяданне «Хвоі гавораць», поўнае роздуму над жыццём чалавека, над яго лёсам. Няма ў ім вострага сюжэта, не багата яно на знешнія падзеі, але насычана ўнутранай дынамікай дзеяння. Дзядзька Язэп носіць у сэрцы вялікі боль, пакутуе ад весткі аб смерці сына Міхала, які памёр ад сухот, атручаны газамі на вайне. Гаворыць ён аб асеннім надворі, пералётных птушках, пра хвоі, якія шумяць і гавораць аб новым жыцці, але думкі яго ўвесь час скіраваны на Міхала. Хвалюе невялікая замалёўка «Начлег у вёсцы Сінегах» сваім гуманістычным настроем, паказам таго, што цяжар вайны лёг на плечы не толькі чырвонаармейцаў, але ўскосным чынам і на дзядзьку Язэпа, і на хлапчука-пастушка.

Побач са скупымі на палітру апавяданнямі «Броня Казакевіч» і «Рамонтная брыгада», якія звязаны між сабою і нагадваюць дакументальны нарыс, у аднатомніку ёсць цікавы твор «Семнаццаць год». Лаканічна, з эпічным спакоем і хранікальнай паслядоўнасцю, характэрнымі для буйных твораў пісьменніка, апавядаецца ў гэтым творы пра пакутлівы і цяжкі шлях селяніна Пятра Тадоравіча, які шукаў свайго шчасця ў пяці дзесяцінах уласнай зямлі, але знайшоў яго ў рэвалюцыйнай барацьбе.

Сапраўды вялікае майстэрства К. Чорнага-навеліста, каларыстычныя і сатырычныя фарбы, яркія мастацкія дэталі, умелая кампазіцыйная будова відаць у апавяданнях «Мураваны скляпок» і «Макаркавых Вольк». Ніяк нельга забыць Тоню Базылькевіча па мянушцы Дойла («Мураваны скляпок»). Здатны да працы і цегавіты, ён амаль аслеп, выкручваючыся ад службы ў арміі. Яго ашуквае кулак Бірыла, няўдала сватаецца Базылькевіч да Насці, паводзіць сябе так, што і да любай дзяўчыны знайшлася мянушка. Але ўжо не той час, каб застукалі чалавека, і Тоня знаходзіць сваё месца ў жыцці і працы. У апавяданні надзвычайная пластыка слова, важкасць і лаканізм, вобразы надзелены трапнымі і запамінальнымі дэталямі. К. Чорны як сатырык добра бачны ў апавяданні «Макаркавых Вольк», у якім пісьменнік стварае каларытны вобраз Сафрона Дзядзюлі. Прыкінуўшыся актывістам, Дзядзюля помсціць Вольцы. Ён закідае ўстановы, дзе вучылася дзяўчына, рознымі паклёпніцкімі даносамі. Дапаўняе вобраз канцоўка: замест удзячнасці Вольцы за выратаванне ад смерці Дзядзюля застаецца верным свайму характару і піша заяву, у якой бэсціць і зневажае маладога ўрача.

З цікавасцю пазнаёміцца чытач з апавяданнямі «Вялікае сэрца» і «Заўтрашні дзень» — творамі пра гераізм і мужнасць савецкага народа ў грозныя дні Айчыннай вайны.

Рост і станаўленне майстэрства К. Чорнага-раманіста, яго мастацкага стылю відаць у буйных творах, якія змешчаны ў кнізе «Выбранае».

Аповесці «Лявон Бушмар» і «Вясна» паказваюць, як пісьменнік ішоў да свайго ўлюбёнага жанра — рамана-хронікі, у якім заўсёды ёсць шматпланавасць тэмы, глыбокі гістарызм і эпічны размах у паказе падзей і жыцця герояў, філасофскі роздум над жыццём простага чалавека і прызначэннем яго на зямлі. У артыкуле «Рэальнасць, фантазія, вымысел» К. Чорны гаварыў, што «ні ў якім выпадку мы не павінны ізаляваць біяграфію маладога чалавека нашага часу ад тых падзей, якія папяраджвалі нашым дням і падрыхтоўвалі іх». Выходзячы з гэтага, пісьменнік вёў Міхала Тварыцкага, Зосю, Максіма Астаповіча — герояў раманаў «Трэцяе пакаленне» і «Вялікі дзень»—праз вызначальныя гістарычныя этапы, паказваў сацыяльны фон і тое асяроддзе, якое ўплывала на іх характар і зменьвала іх адносіны да жыцця. Цікавыя гэтыя раманы глыбокім асуджэннем селяніна-ўласніка, сваім жыццесцвярджальным пафасам, пастаноўкай вялікіх чалавечых праблем. Многа дадуць рускаму чытачу гэтыя творы ў сэнсе знаёмства з самабытным мастацкім стылем пісьменніка, яго выяўленчымі сродкамі, асаблівасцямі лепкі вобразаў, кампазіцыяй.

Адзіная заўвага ўкладальнікам — варта было змясціць у кнізе які-небудзь драматычны твор, напрыклад, драму «Бацькаўшчына». Гэта пашырала б уяўленне аб жанравым багацці творчасці К. Чорнага.

Цяпер некалькі заўваг адносна перакладу. Радуе сур'ёзны і ўдумлівы падыход і ўвага да мовы пісьменніка, адсутнасць недарэчных скарачэнняў і пераказу. Праўда, трэба адзначыць, што зрэдку трапляюць яшчэ недакладнасці ў перадачы паасобных слоў і фразеалагічных словазлучэнняў. Нельга, напрыклад, згадзіцца з такімі перакладамі: загуменне—ток («Мураваны скляпок»), злыдзень—завістник («Лявон Бушмар»), абзадачваў — смотрел, дзік—дикарь («Вясна»), фалды сукенкі— кармашек, грэбля—плотина, ядловец — ельник, казюлі — гады («Трэцяе пакаленне») і інш.

У папярэднім выданні выбраных твораў К. Чорнага на рускай мове асабліва дрэнна перакладзены быў раман «Трэцяе пакаленне» (перакладчык М. Шамбадал). Сустрэўшыся з цяжкасцямі пры перадачы багатай народнай лексікі і цікавых сінтаксічных зваротаў у творы, перакладчык замест старанных пошукаў слова пайшоў дарогай прымітыўнага спрашчэння і нівеліроўкі мовы К. Чорнага, неапраўданага скарачэння паасобных мясцін, што ў сваю чаргу прыводзіла да парушэння вобразнай сістэмы, парушэння ідэйна-сэнсавай нагрузкі твора. У канчатковым выніку атрымлівалася, што К. Чорны—вялікі мастак слова, тонкі знаўца народнай мовы, выдатны стыліст, майстра псіхалагічнага партрэта ў перакладзе быў не падобны на самаго сябе.

У новай кнізе раман «Трэцяе пакаленне» змешчаны таксама ў перакладзе М. Шамбадала. Параўноўваючы пераклады, бачым, што М. Шамбадал многа і старанна папрацаваў над выпраўленнем недахопаў сваёй папярэдняй працы. Непараўнальна менш стала выпадкаў няправільнага перакладу жывой беларускай лексікі, да мінімуму зведзены скарачэнні аўтарскага тэксту, праяўляецца многа ўвагі да сінтаксічнай будовы сказа. Пераклад значна палепшаны, але агрэхі ў ім яшчэ сям-там трапляюць.

У Чорнага: «Агарод цягнуўся паўз дарогу. Мокры **лёд укрываў двор, па якім цяклі раўчукі снеговой вады**». У перакладзе: «Огород тянулся через (?) дорогу. Двор был покрыт льдом, по которому текли ручейки снеговой воды». У арыгінале: «Я выграбу ў яго ад дарогі **цэлы канец бульбы**». У перакладзе: «Я у него целый мешок картошки накопаю». У арыгінале: «От папабожкаў бы тады!» У перакладзе: «**Вот поклонялся бы!**»

Хацелася б, каб менш было ў перакладзе рамана банальных, збітых штампаў, ворагам якіх быў К. Чорны ў сваёй творчай практыцы, каб больш індывідуалізавана гучала і на рускай мове гаворка дзеючых асоб. Мова краўца, напрыклад, страціла ў значнай ступені свой непаўторны народны каларыт, багацце лексікі і сінтаксісу.

Кніга К. Чорнага «Выбранае» сведчыць, што расце і ўдасканальваецца майстэрства перакладу беларускай прозы на рускую мову, а калектыў перакладчыкаў можа перадольваць цяжкасці і дабівацца сапраўднага поспеху. Трэба пажадаць ім плённай працы ў гэтай справе і паставіць вышэйшыя патрабаванні —прыглядацца не толькі да зместу і значэння слова, але больш прыслухоўвацца да яго гучання, да музыкі сказа, яго формы, бо творы К. Чорнага з гэтага боку яшчэ многае трацяць у перакладзе.

С. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

## Па слядах неапублікаваных пісем

У канцы мінулага года рэдакцыя газеты атрымала пісьмо ад загадчыцы Поразаўскага раённага аддзела культуры тав. Созінавай. Яна скардзілася на абуральныя адносіны метадыста Гродзенскага Дома народнай творчасці тав. Белікава да ўдзельнікаў мастацкіх калектываў, у прыватнасці Навадворскага сельскага Дома культуры, у час правядзення абласнога агляду самадзейнасці.

Начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення культуры паведаміў нам, хаця і са спазненнем, што факты, прведзеныя ў пісьме, адпавядаюць сапраўднасці. Тав. Белікаў вызвалены ад работы метадыста абласнога Дома народнай творчасці.

Да 145-годдзя з дня нараджэння Т. Р. Шаўчэнкі

Тарас Рыгоравіч Шаўчэнка (1814—1861), вялікі ўкраінскі народны паэт-рэвалюцыянер, змагар супраць царызма і прыгонніцтва.

Фатахроніка ТАСС.

## Канцэрт дружбы

Каламыя — цэнтр Гуцульшчыны. У гэты горад днямі прыбылі на гастролі артысты Беларускай дзяржэстрады. Афішы паведамлялі аб канцэрце, які павінен адбыцца над мастацкім кіраўніцтвам артыста Мікалая Шышкіна. Вялікая глядзельная зала самага вялікага клуба горада перапоўнена.

Адкрываецца заслона. Цёплыя задушэўныя словы канферанс'е кранаюць гледачоў:

Милій Украіні,
Рідним українцям
З Мінська привітання
Ми привезли вам.

У праграме канцэрта — песні савецкіх кампазітараў, інструментальная музыка, бытавая сатыра ў малюнках, лірычныя жанравыя песні, беларускія, рускія народныя песні, арыі з опер, арыгінальныя жанглёры, інтэрмедыі.

— У вас, на Украіне, — бандура, а ў нас, у Беларусі, — цымбалы, — звяртаецца да гледача канферанс'е і тут жа прадстаўляе гледачам артыста М. Урбановіча, які на цымбалах выконвае рад беларускіх песень, увертюру з оперы «Кармэн» і варыяцыі на тэму рускай народнай песні «Свеціць месяц».

Затым саліст В. Чучайкін з майстэрствам выконвае песню беларускіх партызан, жартоўную рускую песню «Куманёк», арыю Млынара з оперы «Русалка» Даргамыжскага. З асаблівым уздымам выканаў артыст рускую народную песню «Вдоль по Питерской».

З сатырычнымі замалёўкамі выступіў Г. Ермаловіч. Сёстры Логінавы выконваюць беларускія, рускія народныя і жартоўныя песні.

У канцэрце прынялі ўдзел таксама артысты Б. Нікулін, В. Асокін, І. Вішнеўская, І. Пасынкаў.

Цёпла сустрэлі каламыйчане канцэрт артыстаў. Гэта быў канцэрт дружбы двух народаў.

С. МІНЮК.

г. Каламыя.

## Музеі абменьваюцца дакументамі

Літаратурны музей Я. Купалы за апошні час атрымаў ад Маскоўскага дзяржаўнага літаратурнага архіву рад новых матэрыялаў, якія расказваюць аб раннім перыядзе творчасці Янкі Купалы. Сярод — іх фатакопіі рукапісаў пятнаццаці вершаў, перакладзеных на рускую мову паэтам Е. Нячаевым.

З мемарыяльнага музея Ф. Шкулёва (Малдаўская ССР) нядаўна прыслана пісьмо і фатаздымак Шкулёва з напісаным на ім вершам «Кавалі», які Я. Купала пераклаў на беларускую мову ў 20-я гады.

Дырэктар музея Ф. Шкулёва тав. Стампкоўскі паведаміў, што музей арганізаваў стэнд, прысвечаны жыццю і творчасці Я. Купалы. З беларускага музея накіраваны ў Малдавію для экспанавання матэрыялы пра Я. Купалу. Сярод іх кнігі паэта і фатаздымкі.

# У Кіеве, на Падоле

АПАВЯДАННЕ

Міхайла ЧАБАНІЎСКІ

Па абочыне пыльнага бітага шляху ішоў падарожны. Прысадзістая каржакаватая постаць у світцы, нізка апушчаныя вусы і глыбокія зморшчынкі на твары рабілі яго суровым і засяроджаным. Аднак з-пад густых нахмураных брывоў пазіралі на людзей прачнкнёныя ласкавыя вочы. Здавалася, што чалавек сустрэўся з даўно знаёмымі мясцінамі, так уважліва ён прыглядаўся да ўсяго, што траплялася па дарозе.

Неміласэрна пякло сонца. Пахіленыя вербы мелі такі выгляд, нібы нехта надрэзаў ім карэнне. Усё жывое хавалася ў халадку. Толькі казюлькі поўзалі на гарачым, як чарэнь, шляху, ды адзінокія валы, запражаныя ў мажары, ледзь рухаліся ў напрамку горада. Вось яны, крутарогія, цяжка сапучы, спыніліся і нібы акамянелі на шляху. Маленькі чалавечак у белых штанах пачаў біць іх уздоўж і ўпоперак дручком, але яны на гэта не звярталі ніякай увагі. Заплюшчыўшы вочы, волікі стаялі пад спякотным сонцам і не краталіся з месца. Падарожны наблізіўся да мажары, скінуў шапку:

— Добры дзень, чалавеча! Што здарылася?

Маленькі паганяты, абпёршы пот з ілба, бездапаможна развёў рукамі.

— Сталі... Нібы падурнелі. Нічога не зраблю...

— Хай пастаяць,—параіў спакойна падарожны.—Куды спяшацца? Вязіце ж, напэўна, не сваё, а панскае?.. Пастаяць і пойдуць. Без бізуна і палкі.

— Ды яно і праўда,—ціха адказаў, азіраючыся па баках, чалавек у белых штанах. — Паспеем з козамі на торг...

Сказаўшы так, ён прысеў каля воза, дастаў кісет з тытунём, павярнуўся спіной да сонца і закурыў. Валы стаялі, як укопаныя. Здавалася, яны не зрушыліся б з месца нават тады, калі б з іх здзіралі шкуру. Падарожны падыйшоў бліжэй, пагладзіў крутарогага па шыі, спытаў:

— Як жа завуць вашага пана, чалавеча добры?

— Маркевічам. Чулі можа?

Падарожны паківаў галавою. О, пра гэтага пана ён чуў не раз. Ды і не толькі чуў, але і быў з ім асабіста знаёмы... Хто ж не ведаў кіеўскага дабрадзея Васіля Трахімавіча Маркевіча? Адных пругонных—восемдзесят сёл, а зямлі і лесу—безліч... Пан Маркевіч любіў народную песню, цаніў роднае слова, распаўсюджваў ліберальныя кнігі і газеты. Ужо не раз перадаваў пан Маркевіч, каб падарожны, бываючы ў Кіеве, абавязкова завітаў да яго, пагасцяваў. Пан выхваляўся, што ў гонар дарагога госця вылавіць са сваіх азёр смачных карасёў, засмажыць іх у смятане і падасць разам з падліўкай, зробленай з дарагіх заморскіх він... Зірнуўшы на палатаныя плечы нізенькага чалавека, падарожны спытаў:

— Парабкуеце ў пана?

— Да пакроваў.

— А потым?

Чалавек глыбока зацягнуўся цыгаркаю.

— На цукраварню падамся, а то і так перабуду, пакуль вясна настане... бо адзінокі ж я... А вясной зноўку да пана.

Падарожны прыкрыў вочы густымі брывамі. Вось яно як. Чалавеку ўжо відаць за сорак, а ён яшчэ і не жанаты. Усё жыццё ў наймітах... «Так перабуду, пакуль вясна настане... Так, як і я...» Вось яно якое жыццё людское. Глядзеў ён на плечы найміта і гаварыў невядома каму:

— Валы... яны вось прысталі, а чалавек цягне... ажно пакуль не ўпадзе... Божа літасцівы... Жывёла і тая разумее, а калі ж зразумеем мы?

Наймёт кінуў позірк, а чалавека ўжо няма. Ён перакінуў тарбінку цераз плячо і хутка пайшоў па шляху. Нават не азірнуўся. А чалавечак усё пазіраў услед незнаёмаму, шаптаў перасохлымі губамі.

— Дзіўны пан... Валы прысталі, а чалавек цягне. Аж пакуль не ўпадзе... Хімерыя...

А падарожны ўсё ішоў ды ішоў, прамуючы на Падол. Сонца павольна схілялася да небакраю. Віднеўся Кіеў у перадвячэрніх фарбах, шумеў гандлёвым людам і царкоўным звонам. Чалавек павярнуў у вузкі завулак і павольна пайшоў па пясчанай сцежцы, што вяла на ўзгорак. Каля фортки, убачыўшы нейкую сумную жанчыну, пакланіўся:

— Добрага здароўя вам. З добрым вечарам!

— З добрым вечарам і вас, пане,—адказала жанчына.

— А ці не знойдзецца ў вас месца, каб мне пераначаваць? З дарогі я, стаміўся...

Маладзіца хвілінку падумала, разглядаючы незнаёмага, потым ласкава ўсміхнулася і прамовіла:

— Месца то ёсць. Але ж бедныя мы... Заходзьце, калі ласка.

— З Беларусі? — з цікаўнасцю спытаў падарожны.

— З Белавежы. Чулі, можа?

— Чуў, — паглядзеў ён уважліва на жанчыну. — Даўно са сваіх краёў?

Жанчына адказала, што выйшла замуж за кіяўляніна. Жыла з ім, дзякаваць богу, у згодзе, ды, відаць, нечым бога прагнявілі. Забраў ён мужа мінулай восенню, пакінуў з трыма сіротамі. Вось яны адзін за аднаго меншыя, пастрыжаныя, нібы ягняткі... Яна гладзіць рудыя шорсткія галоўкі дзяцей, і запрашае госця ў хату. Паліваё яму на рукі, садзіць за стол, падае міску поснага баршчу. Госць цікавіцца, як жывуць людзі ў яе родных мясцінах. А што яму адказаць? Яна нядаўна ездзіла ў сваё роднае сяло, забрала маці і вярнулася назад. Аднолькава ўсюды—і тут, і там... Усюды аднолькава.

— Аднолькава добра, ці аднолькава кепска? — перапытаў невядомы і хітра ўсміхнуўся ў свае даўгія вусы.

— Дзе яно там добра... — адказала маладзіца. — Панам усюды добра, а мужыкам... Ды што я вам расказваю, хіба самі не ведаеце?

— Ведаю, — сказаў і нізка нахіліў галаву незнаёмы. — Ведаю, чаму не ведаць? Гнуць спіны нашы людзі, быццам валы тыя... Маўклівыя... Ад малдаваніна да фіна на ўсіх мовах усе маўчаць... Маўчаць! Бо ў раскошы...

Доўга сядзеў незнаёмы, цёмны і грозны. Маладзіца запрасіла яго ў святліцу, але ён адмовіўся. Папрасіў пакласці яму кажух пад грушу ў агародзе, бо, маўляў, казаку мяккай не бывае, як на цвёрдай зямлі. Прыйшла в вячэрні маці гаспадыні, суханькая чорная старая. Яна таксама пачала ўгаворваць падарожнага застацца ў хаце, але той не паслухаў, пайшоў пад грушу.

— Калі я выйшаў у гэтыя краі, то даў сабе слова спаць на двары,— растлумачыў ён з усмешкай, — бо там, дзе я жыву, такой магчымасці няма. Апрача таго, і зоркі не пускаюць у хату. Ківаюць мне, каб не спаў, розуму і галавы каб не прапаў...

Тады маладзіца папрасіла аддаць ёй сарочкі, яна за ноч памые іх і высушыць. Зробіць гэта са здавальненнем, хай пан не турбуецца. Падарожны аддаў сарочку, некалькі хустачак і сарамліва сказаў:

— Калі ўжо вы такія добрыя, то няхай будзе па-вашаму, толькі... Толькі я, ведаеце, патраціў у дарозе грошы, так што другім разам заплачу абавязкова.

Жанчына замахала рукамі.

— Ды што вы, хай бог мілуе! Ніякай платы не патрэбна. А раніцай, калі падарожны прачнуўся і пачаў мыцца каля студні, маладзіца выйшла з хаты і з усмешкаю паклала на зруб некалькі папяровых і сярэбраных рублёў.

— Казалі, што грошай няма, а я вось знайшла. У вашых хустачках завязана было аж дваццаць восем рублёў.

Падарожны ад здзіўлення развёў рукамі.

— Вось дык гісторыя... Чакайце, чакайце, ваша праўда. Бачыце, стараю я, памяць губляю... Адзін вузлік завязаў у Пераяславе, паклаўшы сярэбраны, каб не забыцца купіць кніжку. Другі ў Ягатыне... Вось так і растыцкаў свае грошы па вузлках, а потым і забыўся пра іх.

Падарожны павесялеў, забраў у жменю грошы.

— Бачыце, колькі ў нас грошай! Цэлае багацце... А багацце патрабуе розуму. Інакш яно на вецер пойдзе. Вось цяпер і думайце, куды іх дзяваць, бо вы ж знайшлі іх. Я ўжо ім як бы і не гаспадар. Забытае — усё адно, што згубленае. Думайце.

— Купіце сабе адзенне, чаравікі. У вас ужо амаль што знасіліся боты.

— Ну, сястра, — адказаў падарожны і спахмурнеў. — Не, так не траба рабіць. Зробім вось як. Вы з маці абыйдзеце ўсіх бедных дзяцей на вуліцы. Мы іх абяром сюды, да грушы, і пачастуем. Тады добра выкарыстаем знаходку. Відаць, ёсць тут у вас сіроты, галеча...

І больш ён не хацеў нічога слухаць, апрача, як пра бедных сірот. Наскора паснедаўшы, ён падаўся ў горад, а вярнуўся з вялікімі пакункамі, у якіх былі і цукеркі, і пернікі, і гліняныя пеўнікі, і аксамітныя мядзведзікі ды абаранкі. Разгортваючы пакункі, хваліў цацкі, ветліва і радасна ўсміхаўся.

У наступны дзень на двор сабралася дзесяткі тры малых. Замураныя і змардаваныя, яны туліліся да прызбы, баязліва пазіраючы навакол. Тады ён падышоў да іх, прывітаўся, узяў за рукі і павёў да грушы. Маці з дачкою памылі дзяцей, прычасалі. Потым пасадзілі ўсіх у рад на траве, накармілі баршчом і баранінай, а вусаты дзядзька ўласнаручна падаў кожнаму кулёк з ласункамі. І адразу на двары зацёхкалі салавейкі, закрычалі не сваім голасам гліняныя пеўнікі, загулі трубы. Найменшай дзяўчынцы дастаўся яшчэ і ружовы вяночак з мальвы, сплецены падарожным. Дзяўчынку паставілі ў круг. З малымі за рукі ўзяўся сам вусаты дзядзька і першым пачаў спяваць:

Ой, устань, устань, падаляначка...

А потым гулялі ў доўгую лазу, у ката і мышку, у жмуркі. Дзеці звыкліся з чужым дваром, з незнаёмымі людзьмі, гарнуліся да вусатага лысага дзядзькі, які быў такім добрым да іх. Толькі позна ўвечары разыйшліся яны па хатах, вясёлыя і ўзбуджаныя. На другі дзень раніцай падарожны развітваўся з гаспадарамі. Ён закінуў за плечы тарбінку з чыстай бялізнай, нізка пакланіўся гаспадыні.

— Дзякуй, сястра, за тваё ласкавае сэрца. Не гневайся, што мы крыху патапталі табе агарод. Пойдзе дожджык, і ўсё ажыве...

Маладзіца стаяла каля варот і сумнымі вачыма пазірала на нястомнага чалавека.

— Дык гэта ж вам дзякуй за ваша добрае сэрца, за ўцеху, якую вы прынеслі нашым сіротам. Павек яны гэтага не забудуць.

І пахіліла засмучаны твар, не зводзячы з падарожніка вачэй.

— Вы хоць скажыце, як вас завуць, каб ведала я, што адказаць людзям, калі запытаюць. Хто ж вы такі?

Той спакойна павярнуўся, зірнуў на жанчыну.

— Ды так і скажы, сястра, што быў адзін падарожны чалавек, якому бог не даў ні хаціны, ні жонкі, ні дзетак. Ходзіць той падарожны па зямлі, гаруе, калі бачыць замурзанае дзіця ў лебядзе, бо можа і ён некалі рос так у бур'янах, у галечы ды нястачы. Заставайся ж з богам. Дзякуй табе, сястра!..

Так і пайшоў. Прамінуў ужо некалькі хат, павярнуўся, ветліва памахаў рукою. А тут насустрач яму размаляваны вазок з кучарам на казлах, з будай, пад якой — сам пан Маркевіч. Пабачыў Маркевіч падарожнага і гукнуў:

— Тарас Рыгоравіч! Пазце наш каханы! Дык мы ж шукаем вас...

Жанчына, калі пачула гэтыя словы, ажно ўжахнулася. Дык вось хто начаваў у яе пад грушаю! Перахілілася цераз тын, каб лепей чуць. А Тарас Рыгоравіч зняў шапку, пакланіўся, але да Маркевіча не падыйшоў.

— Спяшаюся я, дабрадзею, можа іншым разам зайду. А цяпер шлях мой да Чыгірына. Прабачце ўжо...

Ён яшчэ раз махнуў шапкай і пайшоў. Пан Маркевіч ажно зубамі скрыгатнуў, тыцнуў кулаком у спіну кучара, закрычаў не сваім голасам:

— Быдла! Бач, гонар... Ха-ха-ха... З наймітам дык меў жаданне і час пагаварыць, падбухторваў супраць нас, а мне нават рукі не падаў.

Пан Маркевіч патрос у паветры сваім валасатым кулаком, тыцнуў у буду. Вазок схаваўся ў хмарах пылу. Маладзіца выбегла за вароты, спынілася на рагу, прыклала далонь да вачэй... Тарас Рыгоравіч выходзіў за горад на біты шлях.

Пераклаў з украінскай мовы

Р. Няхай.

# Мастацтва свабодных народаў

Ужо больш двух месяцаў калышуцца сцягі на франтоне Цэнтральнай выставачнай залы ў Маскве, дзе адкрыта выстаўка твораў выяўленчага мастацтва сацыялістычных краін.

Амаль ніколі не знікае вялізная чарга жадаючых паглядзець гэтую першую Міжнародную выстаўку, якая ў такіх шырокіх маштабах дэманструе дасягненні выяўленчага мастацтва краін сацыялістычнага лагера.

Тут паказана звыш 2 000 работ жывапісу, графікі і скульптуры створаных, галоўным чынам, пасля вайны.

Цэнтральная тэма выстаўкі — чалавек сацыялістычнага грамадства, яго барацьба за пераўтварэнне свету, за мір, дэмакратыю і сацыялізм. Усе раздзелы выстаўкі ярка дэманструюць новыя гуманістычныя прынцыпы сацыялістычнага мастацтва, якое процістаіць буржуазнаму мастацтву. Высокі ўзровень выканання, вялікае прафесійнае майстэрства — адметныя рысы большасці твораў. У меншай ступені гэта можна сказаць аб польскім раздзеле, дзе заўважаецца ўплыў абстрактнага буржуазнага мастацтва.

Краіны — удзельніцы выстаўкі размешчаны па алфавіту. Таму першай паказвае сваё мастацтва Албанія. Гераічнае мінулае маленькага народа, яго імкненне да свабоды, барацьбы нядаўняй барацьбы за свабоду, радасныя пейзажы прыгожай горнай краіны, працу людзей, вуліцы гарадкоў і вёсак шчыра і ўсхвалявана паказваюць албанскія мастакі. Манументальны, эпічны вобраз нацыянальнага героя Скандэрбега стварыў у бронзе скульптар Паскалі Адзісэ Паскаль. Карціна Займі «Падпольшчыкі слухаюць перадачу з Масквы» знаёміць нас з албанскімі маладагвардзейцамі. Мастак Кацэлі ў карціне «Начная змена», Міё ў карціне «Збор буракоў» паказваюць сваіх сучаснікаў за працай. Цяжкае мінулае мы бачым на карціне Кадэлі «Яе прадалі старому».

Балгарскія майстры, акрамя карцін, звязаных з барацьбой народа за свабоду, паказалі многа цікавых партрэтаў. Сярод іх звяртае на сябе ўвагу ўдалы партрэт Георгія Дзімітрава работы Ненава Івана, выкананы ў вельмі складанай тэхніцы каменнай мазаікі. Цікава задумана і выканана скульптурная група Крумава «У горы». Запамінаюцца лісты вугалем Даскалава «На беразе Агосты, 1923 г.», «У чаканні сігналу да паўстання». На карціне Стаяна Венева «Развітанне» партызан з вінтоўкай у руцэ, схіліўшыся над калыскаю дзіцяці, развітваецца з сям'ёй перад адыходам у атрад.

Венгерскія таварышы экспануюць кампазіцыі на гісторыка-рэвалюцыйныя тэмы. Гэта перш за ўсё вялікая карціна Д. Кадара і Д. Канечні «Перад бурай» аб паўстанні сялян у 1514 г. Мастак Легендзі Йожэф у карціне «Допыт патрыётаў з Корвін-Кеза» паказвае трагічны эпізод нядаўняга мінулага. Раз'юшаныя бандыты здзекуюцца з арыштаваных патрыётаў. У правай частцы карціны ясна чытаецца крымінальнік у характэрным паласатым турэмным убранні з аўтаматам у руках, выпушчаны на свабоду мяцежнікамі.

Многа агульнага ў тэматыцы з венгерскімі мастакамі маюць мастакі Румыніі. Значнае месца займаюць у іх творах тэмы сялянскага жыцця, пейзаж, партрэт. З жывапісцаў поспехам карыстаецца Карнеліу Баба, сталы майстар жывапісу, які ўмее лаканічнымі сродкамі ствараць яркія, запамінальныя вобразы.

Надзвычай цікавае і своеасаблівае, поўнае хараства і энергіі жыццё адкрываецца нам у залах В'етнама. Традыцыйная тэхніка эмагла ў вельмі ўмоўнай і прыгожай манеры перадаць усю паўнату жыцця працавітага і свабодалюбівага народа. Паспяхова асвойваецца новая тэхніка еўрапейскага маслянага жывапісу, і сведчанне таму—поўная паветра і святла карціна «Лодкі ў марскім заліве» маладога мастака Ле Тхань Дык. А колькі радасці і веры ў будучае паказаў Чан Ван Лам у скульптурнай групе «Зямля вярнулася да нас». Малады селянін, нядаўні салдат Народнай арміі, забівае межавы калок на атрыманай зямлі і шчасліва ўсміхаецца жонцы, якая трымае малое дзіця.

Нашы кітайскія сябры яшчэ раз надзвычай шырока і грунтоўна давялі сваімі творамі палажэнне марксісцка-ленінскай эстэтыкі аб тым, што поспех, сіла ўздзеяння мастацкага твора тым мацнейшыя, чым у больш яркай, спецыфічна-нацыянальнай форме выражаны сацыялістычны змест. Нягледзячы на тое, што традыцыйная кітайская манера жывапісу Го Хуа мае многавяковую гісторыю, кітайскія мастакі, карыстаючыся ёю, стварылі цудоўныя, прыгожыя, надзвычай хвалюючыя сучасныя творы, якія дапамагаюць народу ў яго барацьбе з цемрай і адсталасцю. І тут перш за ўсё прыгадаем вялікі малюнак тушшу на паперы мастака Ван Шэн-ле «Восем гераінь кідаюцца ў раку». Гэта вельмі экспрэсіўны малюнак, сюжэт якога ўзяты з эпохі грамадзянскай вайны, сагрэты патрыятычным пачуццём сучасніка і ўдзельніка вялікіх падзей.

Не менш арганічна злілася спецыфічна кітайская форма з сучасным сацыялістычным зместам у калектыўнай працы жывапісцаў сіаньскага філіялу кітайскіх мастакоў «Ва ўсіх галінах вялікі скачок». Гэта вялікі (шырыня звыш 17 метраў) малюнак каляровай тушшу на паперы, дзе вельмі прыгожа, умоў

## *Сціплы працаўнік літаратуры*

*Да 70-годдзя з дня нараджэння Ул. ПІГУЛЕЎСКАГА*

Жыццё і справы чалавека застаюцца ў памяці нашчадкаў толькі тады, калі яны былі накіраваны на карысць свайго народа і радзімы. Да такіх людзей адносіцца і Уладзімір Пігулеўскі, літаратар і мастацтвазнаўца.

Уладзімір Васільевіч Пігулеўскі нарадзіўся 10 сакавіка 1889 г. у небагатай беларускай сям'і ў Гродна. Бацька яго займаў невысокія пасады ў гарадскіх установах, ён прыкладаў усе намаганні, каб пусціць сына ў навуку. Дзякуючы настойлівасці і асабістым здольнасцям, Ул. Пігулеўскі атрымлівае вышэйшую адукацыю. У 1912 г. ён закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Першая сусветная вайна адрывае яго ад любімай прафесіі педагога. Чатыры гады ён прабыў на фронце, затым зноў аддаўся педагагічнай працы, якую працягваў аж да 1950 г.

З прыхільнасцю сустрэў Ул. Пігулеўскі Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю, якая застала яго ў Латвіі. Аднак у 1920 г. у Латвіі ўстанаўліваецца буржуазны рэжым. У красавіку 1920 г. з швейцарскай эміграцыі вяртаецца на радзіму Ян Райніс. З гэтага часу ў Ул. Пігулеўскага пачынаецца дружба з выдатным латышскім пісьменнікам-рэвалюцыянерам. Пры заахвочванні і падтрымцы Яна Райніса Ул. Пігулеўскі прымае плённы ўдзел ва ўмацаванні дружбы і братніх сувязей паміж беларускім і латышскім народамі. У 1924 г. ён пачынае працаваць над перакладам на беларускую мову драмы латышскага пісьменніка Блаўмана «Прапаўшы сын».

Ул. Пігулеўскі ўсё жыццё гарэў жаданнем, каб бліжэй пазнаёміць беларускі народ з літаратурай латышскага народа. Дзякуючы вынікам яго шматгадовай працы, наш чытач на роднай мове пазнаёміўся з творамі Андрэя Упіта, Віліса Лаціса, Анны Саксэ, Індрыкіса Лейманіса, Арвіда Грыгуліса, Анны Бродэле, Ігната Муйжніека, Валдыса Клівера, Яна Гранта і многімі іншымі пісьменнікамі Латвіі. Ул. Пігулеўскі добра разумеў, што перакладная літаратура мае не толькі пазнавальны характар, але і садзейнічае пашырэнню кругагляду чытачоў; яна вучыць паважаць і любіць культуру іншых народаў, выхоўвае ў чалавека высакароднае пачуццё інтэрнацыяналізма.

У сваёй літаратурнай працы Ул. Пігулеўскі прытрымліваўся думкі, што талент неабходны пісьменніку-перакладчыку таксама, як і пісьменніку-аўтару твора. І сапраўды яго пераклады з латышскай мовы на беларускую адзначаны талентам. Ул. Пігулеўскі да перакладчыцкай работы падыходзіў ўдумліва, з творчых пазіцый. Ён імкнуўся захаваць спецыфіку нацыянальных пагаворак, фразеалагізмаў, ідыём, якія маюць гістарычны характар.

З такой жа энергіяй і энтузіязмам Ул. Пігулеўскі папулярызаваў у Латвіі і літаратуру свайго народа. Латышскія часопісы і газеты змяшчалі ў яго перакладах творы беларускіх пісьменнікаў. Мастацкі тэатр Латвіі і па сённяшні дзень з вялікім поспехам паказвае гледачам у перакладзе Ул. Пігулеўскага камедыю Янкі Купалы «Паўлінка».

Вялікай падзеяй у жыцці перакладчыка быў яго прыезд у 1926 г. у Савецкую Беларусь. Міністэрства асветы БССР запрасіла яго і Яна Райніса прыняць удзел у канферэнцыі беларускіх мовазнаўцаў. Праз некаторы час Ул. Пігулеўскі прыехаў на святкаванне 20-годдзя літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа. Тут ён блізка пазнаёміўся з велічнымі дасягненнямі сацыялістычнай культуры беларускага народа. У яго ўстанавіліся сяброўскія адносіны з многімі беларускімі пісьменнікамі. Усё гэта надавала яму энергіі і сілы ў літаратурнай працы. І таму ён з радасцю вітаў у 1940 г. прыход у Латвію Савецкай улады, якая стварыла спрыяльныя ўмовы для працы на ніве літаратуры.

Вялікая Айчынная вайна прымусіла Ул. Пігулеўскага на некаторы час эвакуіравацца ва ўсходнія раёны СССР. Знаходзячыся ў Расійскай Федэрацыі, ён папулярызуе літаратуру братняга латышскага народа. П'еса Яна Райніса «Каханне мацней за смерць» у яго перакладзе і зараз ідзе на сцэне Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Рыгі.

Незадоўга да смерці, у сувязі з правяраднем Прыбалтыйскай вясны, Ул. Пігулеўскі аб'ехаў шматлікія гарады Савецкай Беларусі. Як тэатральны крытык, ён дзяліўся з артыстамі сваім вопытам і ведамі, заахвочваў работнікаў тэатраў настойліва працаваць над павышэннем сцэнічнага майстэрства.

Жыццёвы шлях Ул. Пігулеўскага нечакана абрываецца 17 чэрвеня 1958 г. Ён быў яшчэ поўны творчых задум і магчымасцей працаваць. Тое, што ім зроблена, — дастойны ўклад у культурную спадчыну нашага народа.

Грамадскасць Латвіі высока ацаніла заслугі нашага земляка. «Са смерцю Уладзіміра Пігулеўскага, — пісала газета «Літаратура ун макслса»,— наша рэспубліка страціла эрудыраванага літаратара, сардэчнага, чулага таварыша, які назаўсёды застанецца ў нашай памяці».

Л. МІРАЧЫЦКІ.

## Для брыгад камуністычнай працы

Добрую ініцыятыву праявілі камсамольцы Тэатра юнага гледача. Яны вырашылі ўзяць шэфства над брыгадамі камуністычнай працы паліграфічнага камбіната імя Я. Коласа. Днямі адбыліся першыя сустрэчы артыстаў з мінскімі паліграфістамі. Артысты пабывалі на камбінаце, пазнаёміліся з работай брыгад і цэхаў. Прыйшлі ў тэатр і члены брыгад камуністычнай працы. Яны паглядзелі спектакль «Не верце цішыні» І. Шамякіна, прынялі ўдзел у яго абмеркаванні.

Шмат выказвалася пажаданняў, як лепш арганізаваць дружбу тэатра з брыгадамі камуністычнай працы. У плане калектыву тэатра—дапамога драмгуртку камбіната, арганізацыя сумесных вечароў адпачынку. Для ўдзельнікаў брыгад камуністычнай працы артысты прачытаюць лекцыі па гісторыі тэатра, арганізуюць творчыя сустрэчы.

# Мастацтва свабодных народаў

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

На гэтай жа сцяне экспануецца амаль такі ж вялікі малюнак кітайскай тушшу Гуань Шань-юэ «Горны хутар на ўздыме», дзе асобнымі эпізодамі паказана жыццё і змаганне горных жыхароў за ўсеагульны ўздым дабрабыту кітайскага народа.

Слабей выглядаюць працы ў неўласцівай кітайцам тэхніцы масляна га жывапісу. Але няма сумнення, што настойлівая вучоба і праца дадуць вынікі, і мы будзем мець магчымасць парадавацца поспехам іх і ў гэтай галіне.

Многа агульнага з кітайскім мастацтвам мае мастацтва Карэі. Карэйскія мастакі таксама шчыра імкнуцца не застацца ў баку ад жыцця народа і ўдала працуюць як у традыцыйнай тэхніцы, так і ў сучасным масляным жывапісу.

Яшчэ большых поспехаў у авалоданні сучаснай тэхнікай дасягнулі жывапісцы Мангольскай Народнай Рэспублікі, якія паказалі ў сваіх працах цудоўны край блакітных гор, бяскрайніх стэпаў, дзікіх коней, адважных, мужных людзей, старанных працаўнікоў. Ім вельмі ўдаюцца дынамічныя сцэны з жыцця жывёлаводаў, як, напрыклад, карціна «Бой быкоў» Цэвегжава Очырына або скульптура Жамба Нямына «Утаймаванне скакуна».

Аб'ядноўвае мастакоў азіяцкіх рэспублік тое, што ўласціва вялікаму рэалістычнаму мастацтву, — глыбокі змест, выражаны праз гранічна дасканалую форму, якая мае ярка выяўленую нацыянальную афарбоўку. Традыцыйныя формы жывапісу не перашкаджаюць сучаснаму зместу.

Глядач, узрушаны паўнакроўным, яркім жыццесцвярджальным мастацтвам папярэдніх залаў, трапляе ў раздзел Польскай Народнай Рэспублікі. Некаторыя творы здзіўляюць сваёй тэндэнцыяй паказаць рэальнае жыццё скажоным да непазнавальнасці, тэндэнцыяй разбурэння формы і колеру.

У творах прафесараў Т. Кулісевіча, В. Таранчэўскага, Э. Эйбіша, А. Марчынскага і інш. мы амаль нічога нацыянальна-польскага не знаходзім. І гэта зразумела, бо фармалізм, абстракцыянізм, мастацтва касмапалітычнае па сваёй прыродзе, супрацьстаіць нацыянальнаму духу народа. Твор, які не мае пэўнага зместу, не можа мець адпаведнай і наогул ніякай формы. Бо змест можа праяўляцца толькі праз форму, а форма ў сваю чаргу не можа існаваць сама сабой, нічога не выражаючы.

У краінах капіталізма мадэрнісцкае мастацтва выконвае пэўны са-

Паскалі Адзісэ Паскаль (Албанія) «Скандэрбег».

цыяльны заказ па атручванню свядомасці народаў, па прышчапленню безнадзейнасці, бесперспектыўнасці. А ў сацыялістычным грамадстве такое мастацтва, мякка кажучы, недарэчы, з'яўляецца шкодным анахранізмам.

Есць фармалістычныя ўплывы і ў творчасці некаторых мастакоў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Напрыклад, Дэн Фрыц у партрэце маслам «Прафесар Ломар» серыяй брудных па колеру, адарваных адзін ад аднаго сутаргавых мазкоў, прыблізна, неяк няўпэўнена накідаў нешта, што ледзь нагадвае чалавека ў шапцы каля мальберта з халстом.

Затое немцы паказалі добрую экспрэсіўную скульптуру Крэмера да помніка «Ахвярам фашызма ў Бухенвальдзе» і скульптурныя партрэты.

Цікавы і змястоўны раздзел чэхаславацкага мастацтва. Жыццё народа, чалавек ва ўсіх яго праяўленнях, дружба з савецкім народам знаходзяць адлюстраванне ва ўсіх жанрах, у манументальных пано, скульптурах, у гравюрах і дробнай скульптуры.

Доказам жыццёвасці і сілы сацыялістычнага рэалізма як адзінага творчага метаду прагрэсіўнага мастацтва з'яўляецца найбольш вялікі раздзел выстаўкі—раздзел СССР. Мастакі розных індывідуальнасцей, характараў, тэмпераментаў, схільнасцей, узростаў і почыркаў, мастакі ўсіх братніх рэспублік аб'яднаны агульнай мэтай і агульным творчым метадам. Радасна адчуваеш сябе ў залах нашага раздзела.

Тут прадстаўлены і беларускія мастакі. Прыцягвае ўвагу скульптура «Рабіндранат Тагор» З. Азгура. Дарэчы сказаць, працы скульптара пельмі «акадэмічна» (у лепшым значэнні гэтага слова) выглядаюць і на выстаўцы акадэмікаў «Наш сучаснік», дзе ён паказаў многа твораў. Шырока вядома ў нашай краіне і за яе межамі вырашаная ў героіка-рамантычным плане скульптура народнага мастака БССР А. Бембеля «Герой Савецкага Саюза М. Гастэла». Добра глядзіцца «Ранены воін» Б. Палійчука. Не губляецца сярод многіх твораў аб Леніне малюнак вугалем К. Касмачова «Напярэдадні». На нашую думку, гэты малюнак па глыбіні вырашэння тэмы можа паспяхова спаборнічаць з многімі вялікімі карцінамі. Я. Зайцаў прадстаўлены вядомай нашаму гледачу карцінай «Пахаванне героя-партызана». Вельмі прыгожы, пранікнёны беларускі пейзаж «Вечар» прадставіў В. Цвірка. Лірычнай карцінай «З сенакосу (Песня)»—дыпломнай працай М. Савіцкага заканчваем гэты пералік.

Хочацца думаць, што першая ластаўка будзе не апошняй. За ёй паследуюць наступныя, якія яшчэ больш умацуюць братэрскія сувязі маста коў сацыялістычных краін, дапамогуць ім пераадолець недахопы і цяжкасці, дадуць магчымасць парадаваць адзін аднаго поспехамі ў стварэнні вялікага мастацтва эпохі камунізма.

А.САПЕТКА.

## Фільмы аб савецкіх жанчынах

Як усенароднае свята сустракаюць працоўныя нашай Радзімы Дзень восьмага сакавіка. У гарадах і вёсках Беларусі праходзяць тэматычныя паказы кінафільмаў, якія адлюстроўваюць слаўны гераічны шлях савецкіх жанчын. Многа цікавага гледачам у гэтыя дні расказваюць фільмы «Вясновыя замаразкі», «Лёс Марыны», «Соф'я Кавалеўская», «Дзяўчына з маяка», «Лёс жанчыны», «Батагоз», «Екацярына Вороніна», «Сельскі ўрач», «Дзяўчына-джыгіт», «Кіяўлянка» і інш.

Побач з мастацкімі кінакарцінамі, гледачу рэспублікі паказваюцца і хранікальна-дакументальныя фільмы. Пра вялікія клопаты Савецкай дзяржавы аб маці і дзіцяці расказвае фільм «Клопаты Радзімы». Хранікальна-дакументальны фільм «За шчасце дзяцей», прысвечаны Міжнароднай канферэнцыі ў абарону дзяцей, якая праходзіла вясной 1952 г. ў Вене па ініцыятыве Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын.

У гэтыя дні ў многіх кінатэатрах, клубах, дамах і палацах культуры Віцебскай, Магілёўскай і Маладзечанскай абласцей праводзяцца тэматычныя вечары «Савецкая жанчына— раўнапраўны член сацыялістычнага грамадства», «Гераізм савецкіх жанчын у гады Вялікай Айчыннай вайны і мірнай стваральнай працы», «Савецкія жанчыны ў барацьбе за мір», «Становішча жанчыны ў капіталістычных краінах» і г. д. Многія кінатэатры, выкарыстоўваючы фотарэкламны матэрыял, арганізавалі спецыяльныя стэнды «Слава савецкім жанчынам — працаўнікам сельскай гаспадаркі!», «Савецкія жанчыны — перадавікі прамысловай вытворчасці» і інш.

К. РАМАНОЎСКІ.

4 сакавіка ў Мінску ў Палацы прафсаюзаў адбылося адкрыццё Тэатра народнай творчасці. Тут будуць выступаць лепшыя самадзейныя калектывы сталіцы.

**На здымках:** 1. Сцэна са спектакля па п'есе В. Вольскага «Несцерка» ў пастаноўцы драматычнага калектыву будтрэста № 5 Міністэрства будаўніцтва БССР. 2. У глядзельнай зале.

Фатахроніка БЕЛТА.

# СЭРЦА МАЦІ

Лета тысяча дзевяцьсот сорак першага года.

У Нясвіж уварваліся немцы. Па вуліцах горада фашысты гналі савецкіх салдат. Гэта былі пакалечаныя вайной людзі.

Арыадна Мікалаеўна баялася выйсці з дому і з болем у сэрцы глядзела праз акно на цяжка параненых чырвонаармейцаў, якіх вялі варожыя канваіры. Яна бачыла, як два нашы салдаты падтрымлівалі пад рукі трэцяга. Яго губы патрэскаліся ад смагі і раны кроватачылі. «Хто ж яму акажа дапамогу, — хвалявалася жанчына, — яны ж заб'юць яго!» Арыадна Мікалаеўна не памятае, як схапіла на рукі маленькага сына Алега, зачарпнула ў кубак вады і тут жа апынулася на вуліцы.

— Пан, а пан, — крыкнула яна нямецкаму салдату, — дазвольце, я вады ім... — і паказала рукой у бок ваеннапалонных.

Канваір выбіў з рукі жанчыны кубак з вадой.

— Цурук, матка! — данеслася да яе вушэй чужая мова, а штуршок тупым прадметам у спіну даў зразумець жанчыне, што ў фашыстаў няма сэрца і сумлення.

Увесь дзень перад вачыма жанчыны стаяў гэты паранены салдат. Лёс людзей, якія трапілі ў фашысцкую няволю, не даваў спакою сэрцу маці-патрыёткі. Назаўтра раніцай Арыадна Мікалаеўна сабрала няхітры харч, які яна мела, і пайшла ў цэнтр горада, пакінуўшы сына з дзедам.

На невялікім пляцы, непадалёку ад гарадской ратушы, немцы арганізавалі лагер ваеннапалонных. Ля калючага дроту сабралася ўжо многа жанчын. Адны прынеслі зняволеным сёе-тое перакусіць, другія — шукалі сваіх родных і знаёмых. Да калючай агарожы падыйшла і Арыадна Мікалаеўна. Яна ўбачыла жахлівы малюнак: цяжка параненыя, з пачарнелымі тварамі, чырвонаармейцы ляжалі на зямлі і чакалі прысуду фашыстаў.

Бліжэй да дроту стаяў з перабітай і забінтаванай рукой малады камандзір. На пятліцах яго гімнасёркі чырванелі, нібы рубінавыя зорачкі, два квадрацікі. Калі Арыадна Мікалаеўна хацела перадаць яму праз калючы дрот кавалак хлеба і некалькі свежых гуркоў, ён агледзеўся па баках і сказаў:

— Родная, не трэба, лёс наш «вырашыцца» ў бліжэйшыя суткі. Выратуйце вось гэтае дзіцянё, яму жыць траба...

Лейтэнант кіўком галавы паклікаў хлопчыка, які ляжаў побач з ранеными і нешта перабіраў рукамі. На выгляд яму было не больш чатырох — пяці год. Яго карыя вочкі пільна ўглядаліся ў жанчыну, нібы прасілі: «Выратуйце мяне, я да мамы хачу!». Правая ножка хлопчыка вышэй калена была забінтавана, ён крыху накульгваў, і ўсё гэта выклікала невыказны жаль у жанчыны.

— Забяру да сябе хлопчыка, выратую хоць яго, інакш гэтыя каты знішчаць і дзіця, — гаварыла ўсхваляваная жанчына знаёмаму доктару Шурыгінай.

— Добрае сэрца ў вас, — падтрымала яе доктар. — Толькі гэтыя злыдні не аддадуць хлопчыка. Трэба аформіць належным чынам дакумент. У гарадской управе я сама скажу, што хлопчык хварэе небяспечнай хваробай і яго трэба ізаляваць...

Арыадна Мікалаеўна паказала дакумент управы начальніку лагера і апошні загадаў салдату, каб хворае дзіця перадалі жанчыне.

Маленькі хлопчык з распасцёртымі рукамі кінуўся да сваёй выратавальніцы. Па дарозе дадому хлопчык ахвотна адказваў на ўсе пытанні жанчыны. Ён расказаў, што завуць яго Толікам, маму звалі Ленай, а тату Грышам.

Хлопчык аказаўся кемлівым. Ён памятае, што бацька яго лётаў на самалёце. Далей ён расказваў, як немцы сталі бамбіць горад, як татка пасадзіў яго і мамку з маленькім брацікам Вовам у «грузавічок» і адвёз на вакзал. Там іх пасадзіў у таварны вагон, а сам пайшоў біць немцаў. Як высветлілася, эшалон, у якім ехала сям'я Толіка, трапіў пад бамбёжку паміж Баранавічамі і Гарадзеяй. Тут жа Толіка раніла ў правую ножку. Куды дзелася мамка з Вовікам, — Толік ніяк не мог успомніць. Памятае адно, што з разбітага вагона яго ўзяў на рукі нейкі салдат, паставіў на зямлю, сказаў:

— Хуценька бяжы, хлопчык, вунь пад тыя дрэвы, — і паказаў рукою ў бок высокіх сосен, што стаялі непадалёку ад чыгункі...

Так, размаўляючы, Арыадна Мікалаеўна і хлопчык дайшлі да невялічкага доміка.

— А вось, Толя, і наш дом, у якім ты будзеш жыць. Вуліца наша завецца Ленінскай, а нумар — 55. Прозвішча наша — Шыманоўскія.

Толя адразу звыкся з новай абстаноўкай, з новай сям'ёй. Гестапаўцы тройчы прыходзілі на кватэру Шыманоўскіх, ставілі да сцяны гаспадыню за тое, што яна гадуе сына камуніста. Двойчы хлопчыка раздзявалі, аглядалі прыдзірлівым вокам...

— Усё гэта справа далёкага мінулага, — расказвала Арыадна Мікалаеўна, калі мы наведалі нядаўна яе кватэру. — У гэтым няма нічога незвычайнага і гераічнага. Тое, што зрабіла я, зрабіла б кожная савецкая жанчына.

Арыадна Мікалаеўна перагортвае пажоўклыя лісты сямейнага альбома.

— А вось пісьмы Анатоля, — прадаўжае яна. — Цяпер Анатоль не той, што на картачцы. Дарэчы, вось яго і вайсковы фатаздымак, ён цяпер салдат... А вось, калі ласка, апошняе пісьмо Анатоля, — гаворыць гаспадыня.

Радкі пісьма — яскравае сведчанне вялікай любві і адданасці Анатоля да сваёй прыёмнай маці.

«Добры дзень, дарагая мамачка, дзядуля і Алег!

Мамачка! Прабачце, услед за першым пішу другі ліст. Я чуў па радыё, як адна дзяўчына з Гомеля праз 15 год адшукала свайго бацьку ў Ленінградзе. Я таксама хачу напісаць у газету, каб дапамаглі мне знайсці родных.

Дарагая мамачка! Вы толькі не гневайцеся і не падумайце, што я хачу вас цурацца. Не! Я ведаю, у Вас добрае сэрца і Вы мяне правільна зразумееце. Можа, дзесьці блізка ці далёка мяне штодзень аплакваюць родныя маці і бацька. У маім жыцці Вы назаўсёды застанецеся такой, якой я Вас ведаю, — ласкавай, роднай...»

— Родны мой!—выціраючы хусткай вочы, кажа Арыадна Мікалаеўна.— А хіба ж я калі-небудзь пярэчыла гэтаму? Калі Анатоль адшукае сваіх бацькоў, гэта будзе вялікай радасцю і для яго, і для мяне. Я ганаруся, што ўпільнавала і выхавала Анатоля дастойным сынам нашай вялікай Радзімы.

А. МІРНЫ.

ПА КАНЦЭРТНЫХ ЗАЛАХ

# Адзінаццатая сімфонія Д. Шастаковіча

Прайшло паўтара гады з моманту з'яўлення выдатнага твора савецкай музыкі — Адзінаццатай сімфоніі Д. Шастаковіча, прысвечанай першай рускай рэвалюцыі 1905 г. Сімфонія неаднаразова гучала ў Маскве, Ленінградзе і іншых гарадах краіны, а ў Мінску яна яшчэ не выконвалася. Але вось, нарэшце, і ў беларускай сталіцы афішы паведамілі аб канцэрце, у праграму якога была ўключана Адзінаццатая сімфонія. І нават тыя мінчане, каму пашчасцілівася раней пазнаёміцца з сімфоніяй, якая выконвалася ў іншых гарадах і па радыё, спыталіся таксама трапіць на канцэрт беларускага аркестра, каб зноў паслухаць гэты выдатны твор у жывым гучанні.

Калектыў сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам В. Дуброўскага здолеў раскрыць ідэйную задуму твора і данесці да слухачоў яркія старонкі рэвалюцыйнай барацьбы, насычаныя глыбокім драматызмам. Сімфонія «1905 год» — твор наватарскі і разам з тым надзвычай просты і выразны па форме і сродках выяўлення. Аднак гэта прастата—не прымітыў, а тая вялікая прастата, якая з'яўляецца вылучальнай рысай усіх сапраўды геніяльных твораў сусветнага мастацтва.

У сімфоніі арганічна спалучаецца звязаная з праграмай яркая выяўленчасць, якая выклікае часам канкрэтныя глядзельныя і слухавыя асацыяцыі, і глыбокая ідэйна-філасофская абагульненасць. У гэтым выявілася выдатнае майстэрства Шастаковіча-сімфаніста.

Задача дырыжора пры выкананні сімфоніі, даводзячы да гранічнай канкрэтызацыі выяўленчыя моманты, не адыходзіць ад галоўнай ідэйнай задумы. Не меншыя цяжкасці паўстаюць перад выканаўцам і ў сувязі з тым, што ўсе чатыры часткі сімфоніі (1-я частка — «Дварцовая плошча», 2-я частка — «9-е студзеня», 3-я частка — «Вечная памяць», 4-я частка — «Набат») ідуць без перапынку, і дырыжор павінен здолець правесці праз іх адзіную лінію драматургічнага развіцця.

В. Дуброўскі ў сваёй трактоўцы сімфоніі дасягнуў максімальнага адзінства і стварыў цэльнае манументальнае палатно.

Адзінаццатая сімфонія, як і большасць твораў, звязаных з рэвалюцыйнай тэматыкай, адрозніваецца яркай кантраснасцю і велізарнай дынамічнай магутнасцю. Дырыжор здолеў падначаліць сваёй волі ўвесь калектыў музыкантаў і дамогся ад яго гранічнай сілы гучнасці ў момант дынамічных нарастанняў. Усе кульмінацыі сімфоніі былі яркa ўражлівымі.

Неабходна адзначыць па-майстэрску падрыхтаваную В. Дуброўскім найвышэйшую кульмінацыю другой часткі сімфоніі, якая адлюстроўвае сцэну расстрэлу народа. Тут тэма народнага прычытання «Гой ты, цар наш батюшка» (з харавой паэмы Д. Шастаковіча «9-е студзеня») дасягнула найвялікшай выразнасці.

З вялікай рэалістычнай сілай перадаў аркестр халодную атмасферу царскага самаўладства ў 1-й частцы твора.

Пранікнёна была выканана трэцяя частка сімфоніі, заснаваная на тэме пахавальнага марша «Вы жертвою пали». Асабліва выразна прагучала гэтая тэма ў групы альтоў у пачатку часткі.

З яркай выразнасцю быў раскрыты выканаўцамі баявы рэвалюцыйны дух фіналу сімфоніі. Энергічна, імкліва, з вялікай рытмічнай дакладнасцю прагучалі рэвалюцыйныя песні «Беснуйтесь, тираны» і «Варшавянка». Шкада, што ў заключнай частцы фіналу не ўдаўся перазвон званоў. Два маленькія званочкі ў аркестры ледзь былі чутны, а тут жа павінен быў гучаць трывожны набатзаклік.

У цэлым выкананне Адзінаццатай сімфоніі зрабіла вялікае ўражанне на слухачоў.

Прыкра, што выкананне астатніх твораў з канцэртнай праграмы — сімфанічнай паэмы «Нарач» Ул. Алоўнікава, канцэрта фа-мінор для фартэпіяна і струннага аркестра Баха і асабліва 5-га канцэрта для фартэпіяна з аркестрам Бетховена (салістка—М. Грынберг) —не было на належным узроўні.

Як вядома, 5-ы фартэпіянны канцэрт Бехтовена — адзін з лепшых твораў геніяльнага кампазітара. У ім з вялікай сілай праявілася ўласцівае Бетховену імкненне да гераізацыі і сімфанізацыі канцэртнага жанра. Партыя аркестра ў гэтым творы— не вросты акампанемент, а насычанае глыбокім сімфанічным развіццём аркестравае суправаджэнне. Яно цесна пераплятаецца з партыяй фартэпіяна, служыць яе развіццём і дапаўненнем. М. Грынберг — тонкі мастак — гастралюе ў нас не ўпершыню. Як і раней, яна выканала канцэрт з вялікім натхненнем і высокім майстэрствам, нягледзячы на тое, што ёй давялося іграць на вельмі дрэнным інструменце. У той жа час музыканты іграілі вяла і бледна, між салісткай і аркестрам не было ансамбля, у выніку чаго аркестр месцамі з ёй проста разыходзіўся.

Незразумела, чаму дырыжор В. Дуброўскі і аркестр, якія выканалі такі складаны твор, як Адзінаццатая сімфонія, не змаглі справіцца з акампанементам бетховенскага канцэрта, хоць гэты ж аркестр неаднаразова выконваў яго раней?

Можа, гэта ў нейкай ступені звязана з перагрузкай праграмы. Выконваць у адным канцэрце чатыры вялікія сімфанічныя творы, улічваючы таксама, што сімфонія выконвалася ўпершыню, — ці не завельмі гэта многа і для слухачоў, і для музыкантаў? Думаецца, што гэта толькі стамляе слухачоў і зніжае якасць выканання аркестрантаў.

Хочацца пажадаць, каб Адзінаццатая сімфонія трывала ўвайшла ў рэпертуар нашага аркестра, і выконвалася на тым жа мастацкім узроўні.

Н. КАЛЕСНІКАВА.

## Слова актывістаў сельскага клуба

Горача і ўдумліва абмяркоўваў актыў Пашкаўскага сельскага клуба Магілёўскага раёна мерапрыемствы па прапагандзе гістарычных рашэнняў XXI з'езду КПСС і дапамозе хлебаробам мясцовага калгаса імя Валадарскага ў паспяховым ажыццяўленні сямігодкі. Прыняты канкрэтныя абавязацельствы:

У брыгадных клубах і чырвоных кутках, на жывёлагадоўчых фермах абсталяваць стэнды з лічбамі сямігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі краіны, паказаць перспектыўны план развіцця калгаса на 1959—1965 гады;

Стварыць у сельскім клубе кіналекторый перадавога вопыту сельскай гаспадаркі. Штомесячна праводзіць не менш 2—3 лекцый на агульнапалітычныя і навукова-папулярныя тэмы. Раз у месяц наладжваць вечары жывёлаводаў з цікавай гутаркай і канцэртам мастацкай самадзейнасці;

Ва ўсіх населеных пунктах і на жывёлагадоўчых фермах мець бібліятэкі-перасоўкі;

Дапамагчы ў стварэнні ў кожнай паляводчай брыгадзе харавога, музычнага і драматычнага гурткоў. Штомесячна наладжваць выступленні агітацыйна-мастацкай брыгады сельскага клуба ў брыгадных клубах і чырвоных кутках на фермах.

Загадчыца сельскага клуба П. Смятаніна і бібліятэкарка Г. Кузняцова асабіста ўзялі шэфства над чырвоным кутком адной з жывёлагадоўчых ферм і абавязаліся зрабіць яго ўзорным.

Актывісты Пашкаўскага сельскага клуба звярнуліся да работнікаў усіх устаноў культуры Магілёўскай вобласці з заклікам шырэй прапагандаваць рашэнні XXI з'езду КПСС, усе сродкі культурна-масавай работы накіраваць на паспяховае ажыццяўленне велічных задач сямігодкі.

(Наш. кар.)

З ЗАМЕЖНАЙ ПОШТЫ

# Культурны абмен

У Венгрыі ў гасцях пабываў Дзяржаўны венгерскі тэатр з горада Тыргу-Мурэш (Румынія). Чатыры вечары ён з вялікім поспехам выступаў у Будапешцкім тэатры «Мадач сінхаз», потым паехаў з гастролямі па іншых гарадах краіны. У канцэртных залах публіка цёпла прымала маладых савецкіх артыстаў, сярод якіх былі піяністы Л. Уласенка і В. Васільеў, віяланчаліст І. Альтман і скрыпач І. Тэр-Мергер'еў. З вялікім поспехам прайшлі выступленні чэхаславацкай цымбалісткі Сусаны Рубіцковай.

У Будапешце і Бухарэсце адначасова адкрыліся выстаўкі венгерскага і румынскага народнага мастацтва. У будапешцкай Мастацкай выставачнай зале была арганізавана выстаўка чэхаславацкага дэкаратыўнага мастацтва. Венгрыю наведалі аргенцінскія артысты Тэатра лялек Эльба Вілафане і Яўеў Фазрэгаш, якія былі гасцямі Інстытута культурных сувязей з заграніцай. Сюды прыязджала дэлегацыя савецкіх жанчын на чале з Т. Марозавай па запрашэнню Венгерскага жаночага савета. Гасцямі венгерскага Камітэта абароны міру былі Крыстас Міцха, генеральны сакратар албанскага Камітэта абароны міру, і Хасан Дума, рэктар універсітэта. Шахцёрская дэлегацыя Паўднёвага Уэльса на чале з генеральным сакратаром Д. Эвенсам пазнаёмілася з жыццём венгерскіх шахцёраў. Дэпутат парламента Германскай Федэральнай Рэспублікі, член прэзідыума Свабоднай дэмакратычнай партыі Вілі Радэмахер наведаў Венгрыю з мэтай вывучэння магчымасцей пашырэння эканамічных сувязей Венгрыі і Заходняй Германіі. Тут пабывала суданская гандлёвая дэлегацыя на чале з Ібрагімам Осман Ісхадам. Шэсцьдзесят арабскіх студэнтаў інстытута, адзін выкладчык вышэйшай школы і чатырнаццаць егіпецкіх спецыялістаў прыехалі ў Венгрыю, каб на працягу года прайсці тут вытворчую практыку. Савецкія спецыялісты вывучалі на венгерскіх фабрыках метады вытворчасці гатовага адзення і паперы.

За мінулыя тыдні значная колькасць прадстаўнікоў венгерскай культуры пабывала за мяжой. Дэлегацыя ад прафсаюза артыстаў наведала Чэхаславакію. Намеснік рэктара ўніверсітэта імя Лоранда Этвеша Дз'ёрдзь Секей ездзіў у Польшчу. Вялікая група артыстаў прыняла ўдзел у святкаваннях «Берлінер Фесттаге».

## Опера маладых

Студыя Будапешцкага опернага тэатра — гэта эксперыментальная майстэрня маладых спевакоў, рэжысёраў, дырыжораў, дэкаратараў. Вось ужо другі год працуюць маладыя энтузіясты ў сценах опернага тэатра. Іх пошукі дапамагаюць выхоўваць новых артыстаў, ствараць новы стыль ігры, і аказваюць маладым кампазітарам дапамогу ў стварэнні новых твораў.

Важнейшая задача студыі — пастаноўка новых венгерскіх опер. Вялікае значэнне мае пастаноўка сучасных твораў зарубежных кампазітараў.

На прэм'еры ў чэрвені мінулага года былі паказаны тры творы: камічная опера «Серва Падрона» Пергалезі, другая дзея «Іфегеніі ў Таўрыдзе» Глюка і «Тэлефон» Джанкарло Меноці. Самай удалай аказалася пастаноўка «Тэлефона». Маладыя гаспадары студыі выбралі менавіта гэтую рэч, жадаючы даказаць, што на опернай сцэне ўвасобіць можна не толькі герояў гісторыі і міфалогіі, але і падзеі сучаснага будзённага жыцця. Гэта простая, будзённая любоўная гісторыя. Дух эпохі, **машына** (тэлефон) спачатку ўскладняе, але потым вырашае ўсе праблемы. Зыходзячы з музыкі Меноці, удалося знайсці арыгінальны стыль самапародыі, дасціпнага выкарыстання традыцыйных сродкаў оперы.

У кастрычніку 1958 г. былі паказаны два творы — камічная опера «Маэстра Патэлен» маладога венгерскага кампазітара Іштвана Ланга і опера Стравінскага «Гісторыя салдата».

Пастаноўка оперы Іштвана Ланга з'явілася святочнай падзеяй у гісторыі студыі, быў паказаны новы твор новага кампазітара. Гэта была першая венгерская оперная прэм'ера ў гісторыі студыі. Работа Ланга заслугоўвае той вялікай і беражлівай увагі, якою яна была акружана, падобна першаму дзіцяці маладых бацькоў. Гісторыя падманутага мужа ніка маэстра Патэлена ў оперы паказана хутка, бурна, энергічна, усяго за 35 хвілін у чатырох карцінах. Архітэктура ўсёй п'есы, блізкая да кінематаграфіі, пабудавана на хуткіх і дасціпных пераменах кадраў. Яна патрабавала новых, наватарскіх выразных форм.

Чаму з твораў сучасных зарубежных кампазітараў была паказана менавіта опера Стравінскага «Гісторыя салдата»? Па некалькіх прычынах. Па-першае, цікавы і своеасаблівы жанр гэтай оперы — сумесь музыкі, рэчытатыву, пантамімы і балету. Опера была напісана ў час першай сусветнай вайны, прычым аўтару давялося прыстасавацца да абмежаваных умоў ваеннага часу. Аўтар хацеў стварыць оперу, якую можна выканаць хоць бы на простых кірмашовых падмостках, пры невялікай колькасці выканаўцаў, без усякіх тэхнічных хітрыкаў. Але сам твор можна назваць чым хочаш, толькі не простым. Тон прымітыўны, але распрацоўка складаная. Інструментаў усяго сем, а музыка ўзнікае на скрыпцы простага салдата. Але якія цяжкасці рытму і тэхнічнага парадку прыходзіцца пераадольваць самі музыкантам, каб перадаць «прымітыўную траскатню» простага салдата на танным інструменце!

Узбагачаная вопытам двух год, студыя прыступае да падрыхтоўкі новай прэм'еры (вясна 1959 г.). Апроч новай венгерскай оперы і дакласічнай камедыі будзе паказана аднаактовая опера сучаснага чэхаславацкага кампазітара Багуслава Марціна.

Часопіс «Венгерскія навіны» № 